

АБ ЧЫМ У ПАРЛАМЕНЦЕ ГАВАРЫЛІ З МОЛАДДЗЮ 3

ПРА ГЕРОЯЎ І НААДВАРОТ 13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

2 ЛЮТАГА 2024 г. ПЯТНІЦА № 23 (30157)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Арцём БУТОРЫН, начальнік інфармацыйна-аналітычнага ўпраўлення Генштаба Узброеных Сіл:**

*«Я разумею, што перапрацоўка Ваеннай дактрыны адразу выклікае асцярогі ў насельніцтва ў плане таго, ці не збіраемся мы ваяваць. Хачу супакоіць усіх: ваяваць мы не збіраемся. Мы абнаўляем палажэнні дакумента, каб ён больш адпавядаў тым выклікам і пагрозам, якія існуюць на сённяшні момант. Што датычыцца ядзернай зброі, то Ваенная дактрына не гаворыць аб механізмах, спосабах, формах і тактычных прыёмах прымянення гэтай зброі. Мы ў дактрыне дэкларуем палітычныя моманты, што ядзерная зброя з'яўляецца сродкам стратэгічнага стрымлівання ад развязвання агрэсіі супраць нашых дзяржаў».*

# З новым домам!





Дзяніс і Юлія КАМЕЙКІ пазнаёміліся ў сталіцы, куды прыехалі працаваць, ён — з Чэрвеньскага раёна, яна — з Ліды. Пабраліся шлюбам, нарадзіўся сын Марк, пасля дачка Кіра, нарэшце маленькая Ясенія. Сям'я жыве ў інтэрнаце, Дзяніс працуе вадзіцелем аўтобуса, Юля — у дэкрэтным адпачынку.

Учора ў іх жыцці была адна з самых важных падзей — сям'я атрымала ключы ад новай трохпакаёвай кватэры на вуліцы Ангарскай, пабудаванай праз УКБ Заводскага раёна. З часу, як яны сталі шматдзетнымі, прайшло ўсяго паўтара года. На наваселле Камейкі прыбылі ў поўным складзе. Не забыліся і кошку Мурку, якая першай увайшла ў новае жытла.

**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

## КОРАТКА

- БДУ, БНТУ і не толькі: Мінадукацыі змяніла пералік ВНУ для залічэння без уступных іспытаў.
- **Бранская вобласць хоча больш актыўна прыцягваць да ўзвядзення жылля і сацаб'ектаў беларускіх будаўнікоў.**
- Пасол КНР: у Беларусі вучацца больш за дзевяць тысяч кітайскіх студэнтаў.
- **Паслугі ў сферы аграэкатурызму ў Мінскай вобласці аказваюць у 365 сядзібах.**
- Стартаваў прыём заявак на саісканне прэміі Саюзнай дзяржавы ў галіне навукі і тэхнікі.
- **БНП начала прымаць заяўкі на конкурс «Натарыят і СМІ».**

ISSN 1990 — 763X

24023

9 771990 763008

Вынікі і планы

## Летась у санаторыях пабывала рэкордная колькасць адпачывальнікаў

### Не горшым абяцае стаць і бягучы год

**Кошт аднаго дня ў беларускім санаторыі ў студзені — сакавіку бягучага года абыдзецца ў сярэднім у 102 рублі ў суткі за стандартны двухмесны нумар, у красавіку — чэрвені — 103—105 рублёў. Пры гэтым запатрабаванасць чакаецца высокая. На люты ўжо забраніравана 85 % месцаў, на сакавік — 73 %, красавік — 63 %, май — 60 %. Многія санаторыі адкрылі браніраванне і на летнія месяцы. Пра вынікі работы беларускіх здраўніц летась і планы на бягучы год расказаў дырэктар Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва Генадзь БАЛБАТОЎСКІ.**

### ГОСЦІ З 70 КРАІН СВЕТУ

Ён паведаміў, што мінулы год быў паспяховы для сістэмы аздараўлення і санаторна-курортнага лячэння па ўсіх паказчыках. Па большасці з іх удалося перавысіць планавыя лічбы. Так, сярэднегадавая запатрабаванасць беларускіх здраўніц склала 84,1 %. Рэкордная стала лічба тых, хто аздараўіўся і адпачыў у санаторыях — 1 мільён 483 тысячы чалавек. Дынаміка па выручцы склала 21 % і перавысіла 1 мільярд 63 мільёны рублёў.

Экспарт паслуг таксама вырас. Колькасць замежных адпачывальнікаў павялічылася на 15,5 % і склала за год 217,5 тысячы чалавек. Больш за 95 % гасцей — расіяне. Аднак, усяго беларускія здраўніцы ў мінулым годзе наведалі прадстаўнікі 70 краін.

— Санкцыйны ціск і рыторыка заходніх суседзяў адыгралі сваю ролю, і нягледзячы на бязвізавы ўезд, у нас знізілася колькасць грамадзян з заходніх краін. Але згодна з апошняй інфармацыяй, якую мы атрымліваем са штотыднёвых зводак, штодзень у нашых санаторыях адпачывае каля 100 грамадзян з краін Балтыі і Польшчы, — адзначыў Генадзь Балбатоўскі.

СТАР. 2

Журналіст мяняе прафесію

## ДНК ЯЛОВАЙ ШЫШКІ

### Карэспандэнт «Звязды» папрацавала на будучае беларускіх лясоў

**Калі нехта думае, што збіраць шышкі справа не сур'ёзная, ён глыбока памыляецца. Гэта толькі пачатак вялікай работы над аднаўленнем лясоў. У лясгасах наладжаны цэлы працэс па здабычы з шышкі якаснага насення. У Год якасці было асабліва цікава паназіраць за тым, як усё адбываецца. І Магілёўскае лесагаспадарчае аб'яднанне дало такую магчымасць, арганізаваўшы прэс-тур.**

### ДРЭВЫ СА ЗНАКАМ «+»



Знаёмства з гэтай справай адбылося на тэрыторыі Горацкага лясгаса. Ён ахоплівае лясістыя плошчы трох раёнаў — акрамя Горацкага, яшчэ Дрыбінскага і Мсціслаўскага. Невялікія яго ўчасткі знаходзяцца таксама ў Крычаўскім, Чавускім і Аршанскім раёнах. Лесанасенных плантацый у лясгаса некалькі. Там растуць лістоўніца, сасна, дубы. Але перыяд жалудоў прайшоў, зараз уся ўвага збору насення хваёвых культур.

Адна з лесанасенных пляцовак знаходзіцца на землях Цемналескага лясніцтва, што ў Дрыбінскім раёне. Тут расце елка еўрапейская ІІ парадку. Нумар сведчыць, што дрэвы прышчэпленыя лепшымі ўзорамі ў маштабах краіны.

СТАР. 4

З першых вуснаў

# «ТРЭБА АБ'ЯДНАЦЬ НАШЫ МАГЧЫМАСЦІ НА НЕАБСЯЖНЫМ БЕЛАРУСКА-РАСІЙСКІМ РЫНКУ»

## Аляксандр Лукашэнка правёў сустрэчу з губернатарам Бранскай вобласці

**Увогуле губернатар Бранскай вобласці — часты госць Беларусі. Рэгулярныя візіты абумоўлены плённым супрацоўніцтвам з нашай краінай, прычым у многіх сферах. Аб гэтым, у прыватнасці, сведчыць насычаная праграма бягучай паездкі: адбылася сустрэча Аляксандра Багамаза са старшынёй Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта Іванам Крупко, дэлегацыя Бранскай вобласці наведала ААТ «Рагачоўскі МКК» і Цэнтр алімпійскага рэзерву ў Жлобіне. Пасля перагавораў з Прэзідэнтам Беларусі ў Палацы Незалежнасці, дзе шырока абмяркоўваліся перспектывы далейшага ўзаемадзеяння, Аляксандр Багамаз сустрэўся з намеснікам прэм'ер-міністра Леанідам Зайцам, а таксама наведаў унікальныя вытворчасці Беларускай нацыянальнай біятэхналагічнай карпарацыі і адну з найбуйнейшых кандытарскіх фабрык нашай краіны «Камунарка».**

### СУВЯЗІ ТРЫВАЛЫЯ І ШМАТГРАННЫЯ

На пачатку сустрэчы кіраўнік дзяржавы пажартаваў, што губернатар Бранскай вобласці доўга ехаў у Мінск. «Але добра, што ў Гомелі бываеце часцей, а губернатар (Гомельскай вобласці. — «**Зв.**») — у Бранску па суседстве бывае, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Я папрасіў Івана Іванавіча Крупко, каб ён больш шчыльна супрацоўнічаў з Бранскай вобласцю. Нашы людзі. Такія, як і ў Гомельскай вобласці». Прэзідэнт праінфармаваны аб аднаўленні добрых кантактаў паміж абласцямі, а таму ўсяляк будзе іх падтрымліваць.

Прэзідэнт адзначыў, што Браншчына разам са Смаленскай і Пскоўскай абласцямі з'яўляюцца самымі блізкімі рэгіёнамі для Беларусі. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, як у складаныя часы беларусы дапамагалі суседзям (і не толькі ў Бранскай вобласці) з сельскагаспадарчай тэхнікай. «З савецкіх часоў у нас склаліся цёплыя, сяброўскія, добрыя, братэрскія адносіны паміж народамі, — падкрэсліў ён. — Дзякуй Богу, што мы не накрэслілі граніцу, праз якую трэба праходзіць і стварыць нязручнасці для нашых людзей, як гэта здарылася з Польшчай, краінамі Балтыі, яшчэ горш, з Украінай».

Па словах Прэзідэнта, даўнія гістарычныя і чалавечыя сувязі паміж Беларуссю і Браншчынай вельмі трывалыя і шматгранныя. «У поўнай меры ўсё гэта датычыцца і іншага нашага бліжэйшага суседа — Чарнігаўскай вобласці Украіны, — дадаў ён. — На граніцы трох рэспублік заўсёды панаваў дух добрасуседства, сяброўства і супрацоўніцтва. Цяпер — усё наадварот. Да глыбокага нашага шкадавання. У гэтай сітуацыі беларусы абсалютна салідарныя з вамі, суперажываюць, гатовы дапамагчы ўсім, чым толькі мы можам».

### «МІЛЬЯРД — ГЭТА ДАЛЁКА НЕ ГРАНІЧНЫ ПАКАЗЧЫК»

У каторы раз беларускі лідар паўтарыў, што аснова асноў для вырашэння цяперашніх і магчымых будучых праблем — гэта эканоміка. Ён нагадаў, што ў 2020 годзе ставілася задача падняць тавараабарот паміж Беларуссю і Бранскай вобласцю да мільярда. «У мінулым годзе мы крыху знізілі (тэмп росту тавараабароту. — «**Зв.**») па розных прычынах — дзесьці 800 мільёнаў долараў, крыху больш, — канкрэтызаваў Аляксандр Лукашэнка. — Але ў гэтым годзе мы поўныя рашучасці аднавіць гэтую лічбу. Думаю, нікога не трэба пераконваць, што мільярд — гэта далёка не гранічны паказчык. І галоўны рэзерв — рэалізацыя буйных кааперацыйных прамысловых праектаў. Як гэта арганізавана, мы наглядна бачым на прыкладзе работы вашых прадпрыемстваў і нашых «Амкадора» і «Гомсельмаша». Мы гатовы і далей развіваць гэты вопыт, уключаючы стварэнне ў Бранскай вобласці іншых прадпрыемстваў па вырабе тэхнікі, матэрыялаў, абсталявання — усяго, што вам спадабаецца і мы зможам».

Па словах кіраўніка дзяржавы, ёсць чаму адзін у аднаго павучыцца і ў сельскай гаспадарцы. «Тым больш што ў нас падобныя і землі, і кліматычныя ўмовы, — удакладніў Прэзідэнт. — Мы ведаем, што Браншчына лідзіруе па выпуску асобных відаў сельгаспрадукцыі і ставіць рэкорды па ўраджайнасці бульбы, збожжавых (жыта і трыцікале ў прыватнасці). На добры ўзровень у вас выйшла жывёлагадоўля. Для нас гэта таксама адзін з прыярытэтаў і шырокае поле для сумеснай дзейнасці».

### «МЫ ГАТОВЫ ЎКЛЮЧАЦЦА»

Кажучы аб Беларускай нацыянальнай біятэхналагічнай карпарацыі, якую расійская дэлегацыя наведвае падчас свайго візіту ў Беларусь, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што гэта ўнікальны вытворчы вопыт. Ён расказаў, што на прадпрыемстве вырабляюцца добрыя кармы. У перспектыве пачнецца выпуск ветэрынарных прэпаратаў і абсталявання для жывёлагадоўлі.

«Гатовы пашыраць пастаўкі прадуктаў харчавання і іншых тавараў, абсалютна не перашкаджаючы вашым вытворцам і нават не канкуруючы з вамі, — дадаў Прэзідэнт. — Трэба аб'яднаць нашы магчымасці на неабсяжным беларуска-расійскім рынку».

На думку беларускага лідара, вялікія перспектывы мае і навукове супрацоўніцтва ў аграпрамысловай галіне. «Насеннюводства, выпрабаванні сартоў раслін, селекцыйная работа — гэта тое, што ўжо робяць нашы навукоўцы ў рамках узаемадзеяння з Бранскай вобласцю, — удакладніў Аляксандр Лукашэнка. — Хацелася б, каб гэтыя сумесныя праекты павялічваліся, але з гранічнай арыентацыяй на практыку. Не толькі на тэорыю, а і на практыку».

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на тое, што на Браншчыне добра ведаюць, як працуюць беларускія будаўнікі. Напрыклад, у мінулым годзе ў Бранску рэалізаваны інвестыцыйны праект па будаўніцтве 16-павярховага жылога дома. «Калі вас задавальняюць нашы будаўнікі, мы будзем з вамі ў гэтым плане і далей супрацоўнічаць, — падкрэсліў беларускі лідар. — Ведаю па перагаворах з Прэзідэнтам Расіі, вялізныя задачы стаяць у будаўніцтве: ад дарог — да будаўніцтва культурных, прамысловых аб'ектаў і перш за ўсё жылля. Мы гатовы ўключацца».

Тым больш, як заўважыў Прэзідэнт, гэта выгадна абодвум бакам. Невыпадкова такі вопыт супрацоўніцтва запатрабаваны і ў іншых рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі.

Беларусь гатова прапанаваць свае паслугі і ў капітальным рамонце жылля і будынкаў, будаўніцтве дарог, праектаванні і правядзенні інжынерных пошукаў. Як заўважыў Аляксандр Лукашэнка, у нас ёсць добрыя спецыялісты, высакаякасная тэхніка, абсталяванне для сфер водазабеспячэння, водаачысткі, ацяплення, перапрацоўкі смецця і шмат іншых перспектыўных кірункаў.

«У поўнай меры гэта датычыцца тых праблем, якія падкінуў нам з вамі і Чарнобыль, — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы. — Браншчына як ні адзін рэгіён Расіі, таксама як і Беларусь, пацярпела ад чарнобыльскай катастрофы. Сёння мы бачым наступствы, асабліва кадравыя. Асабліва вы гэта адчуваеце. Мы займаемся адраджэннем гэтых тэрыторый (вы ведаеце нашы праграмы), стварэннем нармальных умоў для жыцця людзей. Ёсць унікальныя методыкі, распрацоўкі. Калі яны вам цікавыя, мы гатовы супрацоўнічаць».

Рэзюмуючы, Прэзідэнт падкрэсліў, што беларускі бок гатовы выслухаць усе прапановы гасцей Палаца Незалежнасці і пры неабходнасці аператыўна прыняць адпаведныя рашэнні.

**Вераніка КАНЮТА.**

### ❍ У тэму

У размове з журналістамі **губернатар Бранскай вобласці Аляксандр БАГАМАЗ** адзначыў, што ўзаемадзеянне гэтага расійскага рэгіёна з нашай краінай ужо прынесла эфект. У прыватнасці, на Браншчыне паспяхова працуюць беларускія будаўнікі. Па словах губернатара, адначасова на некалькіх пляцоўках будуюцца шматпавярховыя дамы. Узвядзеннем жылля займаюцца спецыялісты з Гомельскай і Магілёўскай абласцей.

Аляксандр Багамаз звярнуўся да нашага Прэзідэнта з просьбай, каб беларускія будаўнікі ўзводзілі ў гэтым рэгіёне і сацыяльныя аб'екты. «Мы будуем тры школы на 1225 месцаў, дзве школы па 500 месцаў і шмат спартыўных збудаванняў, — канкрэтызаваў ён. — Аб'ём у нас вялікі, сваіх будаўнікоў не хапае, а будаваць трэба».

Губернатар Бранскай вобласці адзначыў, што іх спецыялісты ў галіне сельскай гаспадаркі рэгулярна вучацца ў сваіх калег-беларусаў. «Сёння маем нядрэнныя вынікі на бранскай зямлі, — заўважыў ён. — У нас у краіне мы першыя па ўраджайнасці рапсу, кукурузы і бульбы (вырабляем кожны пяты кілаграм бульбы ў Расіі)».

Па словах кіраўніка расійскага рэгіёна, у вырошчванні сельскагаспадарчых культур на Браншчыне аддаюць перавагу сартам беларускай селекцыі. Аляксандр Багамаз расказаў, што іх рэгіён таксама зацікаўлены ў развіцці прамысловай кааперацыі з Беларуссю.

Асаблівы акцэнт падчас сустрэчы з беларускім лідарам быў зроблены на ўзаемадзеянні моладзі. Адным з такіх мерапрыемстваў, як анансаваў губернатар, стане сумесны чэмпіянат (Бранскай і Гомельскай абласцей) па хакеі.

# Летась у санаторыях пабывала рэкордная колькасць адпачывальнікаў

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Выручка ад экспарту паслуг вырасла на 26 % і перавысіла 311 мільёнаў рублёў.

Значна больш укладанняў зрабілі санаторыі ў абнаўленне матэрыяльна-тэхнічнай базы і набыццё абсталявання. На гэта было выдаткавана 159 мільёнаў рублёў, што ў 1,6 раза больш, чым у 2022-м (98 мільёнаў).

Выкананы і сацыяльныя праекты і дзяржпраграмы па аздараўленні — па льготных пуцёўках у санаторыях прайшлі лячэнне і адпачылі 793 тысячы чалавек. Гэта таксама найвышэйшы паказчык за апошнія гады.



Генадзь Балбатоўскі нагадаў, што інваліды 1—2 груп могуць атрымаць бясплатную пуцёўку ў санаторый раз на два гады. Непаўнагадовыя могуць аздаравіцца раз на год ва ўсіх тыпах лагераў — з дзённым і кругласутачным знаходжаннем, а таксама спартыўным. Такім чынам, на працягу двух месяцаў дзіця можа знаходзіцца ў лагерах па пуцёўках з дзяржпадтрымкай.

Улічваючы высокі працэнт браніравання ў санаторыях на вясенні месяцы, мяркуецца, што бягучы год стане не менш паспяховым. Чакаецца, што гэта дазволіць павялічыць выручку не менш чым на 10 %, а экспарт паслуг — не менш чым на 15 %.

### КАЛЯ 105 РУБЛЁЎ ЗА СУТКІ

Кошт пуцёвак на аднаго чалавека летась склаў у сярэднім 92 рублі ў суткі за стандартны двухмесны нумар. У першым квартале гэтага года — 102 рублі, што на 4 % ніжэй за снежаньскія цэны 2023-га. У другім квартале гэтага года рост цэн не будзе перавышаць 4 % і складзе 103—105 рублёў у суткі.

Гэта цэны для пуцёвак у вольнай рэалізацыі. Цана для льготных катэгорый грамадзян, якія атрымліваюць пуцёўкі праз Рэспубліканскі цэнтр па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва, складае 65 рублёў у суткі.

Комплекс паслуг у санаторыях штогод удасканальваецца, новыя з'яўляюцца літаральна кожны дзень.

— Набываецца новае самае дасканалае абсталяванне, удасканальваюцца методыкі. Мы робім акцэнт на выкарыстанні прыродных фактараў. Нядаўна ў мяне была сустрэча з прадстаўнікамі швейцарскай кампаніі, якая зацікаўлена ў продажы нам абсталявання, таму комплекс паслуг пастаянна развіваецца, — адзначыў Генадзь Балбатоўскі.

### АМБІЦЫЙНЫЯ МЭТЫ ПА АЗДАРАЎЛЕННІ ДЗЯЦЕЙ

Падчас дадатковых канікул для вучняў 1-2 класаў з 19 да 25 лютага больш за 14 тысяч дзяцей пройдуць аздараўленне ў лагерах, найперш дзённай формы. Пачата работа і па летняй аздараўленчай кампаніі. Тут пастаўлены амбіцыйныя мэты — аздаравіць каля 400 тысяч дзяцей. Летась гэта лічба склала 388 тысяч.

— Фінансаванне пацверджана і выдаткавана. Плануюцца работы па прывядзенні матэрыяльна-тэхнічнай базы ў гатоўнасць прыняць летам такую колькасць дзяцей, — дадаў Генадзь Балбатоўскі.

**Алена КРАВЕЦ.**

# ДЫЯЛОГІ АБ МІРЫ І БУДУЧЫНІ

## Спікеры абедзвюх палат парламента сустрэліся з удзельнікамі Форуму маладых выбаршчыкаў

**Форум, у якім прымаюць удзел больш за сто юнакоў і дзяўчат, якія ўпершыню ў жыцці будуць галасаваць на выбарах, праходзіць у Мінску на працягу 1-2 лютага. Дыялог Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі КАЧАНАВАЙ з моладдзю адбыўся ў Савеце Рэспублікі. Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА размаўляў з юнымі выбаршчыкамі ў Авальнай зале Дома ўрада, дзе працуе дэпутацкі корпус.**

### «ГЭТА СПРАВА ЎСІХ НАС — ВЫЗНАЧАЦЬ БУДУЧЫНЮ НАШАЙ КРАІНЫ!»

Звяртаючыся да ўдзельнікаў форуму, Наталля Качанава зазначыла: «Вы не проста будзеце галасаваць — вы будзеце вызначаць будучыню краіны. Вы і ёсць яе будучыня!»

Сустрэча моладзі і спікера верхняй палаты парламента адбылася ў Савеце Рэспублікі і стала значнай падзеяй не толькі ў праграме форуму, але і ў жыцці кожнага з яго ўдзельнікаў. Калі яшчэ ім давядзецца пабываць тут і вось так, блізка, пагаварыць са Старшынёй верхняй палаты парламента, задаць ёй свае пытанні і атрымаць грунтоўныя і шчырыя адказы?.. Як заўважыла Наталля Качанава, у нашай краіне ўсё магчыма, трэба толькі адказна ставіцца да працоўных абавязкаў, цаніць людзей і справядлівасць. І такіх людзей у нас абавязкова заўважаць, дапамогуць раскрыць увесь патэнцыял, рэалізавацца абсалютна ў любой галіне: ці то медыцына, ці то педагогіка альбо палітыка...

Размаўляючы з хлопцамі і дзяўчатамі, спікер закранула шырокае кола пытанняў, расказала аб эканамічнай сітуацыі ў краіне і знешнепалітычнай карціне вакол Беларусі і не толькі. У дачыненні эканомікі яна адзначыла, што мінулы год толькі радуе дасягнутымі паказчыкамі: унутраны валавы прадукт склаў 103,9 %, вырас экспарт. Эканоміка ўвогуле працуе ўпэўнена і стабільна, фарміруецца бюджэт, які дазваляе выконваць усе сацыяльныя праграмы. Краіна імкнецца далучыцца да найбуйнейшых эканамічных арганізацый — ШАС, БРІКС.

«Я пераканана, што цвярозы розум павінен перамагчы», — так пракаментавала Наталля Качанава палітычную сітуацыю ў свеце, у прыватнасці на Блізкім Усходзе. Яна засяродзіла ўвагу моладзі на тым, што сёння як ніколі важна міралюбівая палітыка любой краіны. А наша дзяржава — яскравы прыклад такой палітыкі. І зусім не варта папракаць яе ў адваротным, як гэта робяць некаторыя нашы нядобрыя суседзі: «Вы павінны ведаць, запомніць назаўсёды: ніколі Беларусь не была агрэсарам і ніколі ім не будзе».



Фота БелТА.

Таксама Старшыня Савета Рэспублікі засцерагла юнакоў і дзяўчат ад неабдуманых дзеянняў і карыстання сумнеўнымі крыніцамі інфармацыі, у прыватнасці ўсялякімі тэлеграм-каналамі экстрэмісцкага кшталту: «Навошта іх чытаць? Яны толькі льюць ваду на млын тых, хто хоча разбурыць нашу краіну. Усё тое, што створана за гады суверэнітэту... А захаваць яго вельмі няпроста, як зазначыў наш Прэзідэнт».

І ўсё ж галоўнай тэмай размовы стала менавіта выбарчая кампанія. Моладзь цікавіла практычна ўсё, што датычыцца выбараў, адзінага дня галасавання і дзейнасці заканадаўчай улады. Наталля Качанава падрабязна расказала аб рабоце Савета Рэспублікі ў заканатворчай сферы і зазначыла: «Канешне, гэта цудоўна, што такое мерапрыемства (Форум маладых выбаршчыкаў. — **«Зв.»**) праводзіцца ў нашай краіне. Калі вы можаце пабываць канкрэтна там, дзе распрацоўваюцца законы, прымаюцца вельмі важныя для нашай дзяржавы рашэнні. Галоўны закон — Канстытуцыя — гаворыць, што наша дзяржава прававая, а значыць, мы ўсе з вамі жывём па законах нашай краіны».

Асобна яна спынілася на важнасці работы з насельніцтвам. Сустрэчы з працоўнымі калектывамі і асабістыя прыёмы грамадзян, прамыя тэлефонныя лініі дапамагаюць заканадаўцам вызначыцца з прыярытэтамі, абазначыць галоўныя напрамкі дзейнасці і пры неабходнасці скарэкціраваць існуючыя планы. Немалая частка мерапрыемстваў прысвечана рабоце менавіта з моладдзю. Рэалізоўваецца шэраг маладзёжных праектаў, у тым ліку і міжнародных — «Цягнік Памяці» (колькасць краін-удзельніц у ім апошнім часам значна пашыраецца), «Дзеці садружнасці»...

Працягваючы выбарчую тэму, Старшыня Савета Рэспублікі растлумачыла маладым людзям асаблівасці адзінага дня галасавання ў кожным рэгіёне, падкрэсліла, дзе шукаць дакладную інфармацыю аб выбарчым працэсе. Асобна звярнула ўвагу ўдзельнікаў сустрэчы на тое, што ў гэтым годзе будзе сфарміраваны новы заканадаўчы орган — Усебеларускі народны сход, які стане вышэйшым органам народаўладдзя і будзе вырашаць усе стратэгічныя для краіны пытанні. У яго склад увойдуць 1200 прадстаўнікоў розных прафесій, грамадзянскай супольнасці, дэпутацкага корпуса. Гэта сапраўды важная падзея ў палітычным жыцці краіны.

Увогуле, на працягу сустрэчы Наталля Качанава адказала на шмат пытанняў (дарэчы, менавіта адказы на пытанні склалі большую частку размовы), якія датычыліся ледзь не ўсіх сфер жыцця і прафесійнай дзейнасці. Падсумоўваючы вынікі сустрэчы, яна заўважыла, што інтарэс моладзі да жыцця краіны, яе неабыякавасць — гэта вельмі добры знак: моладзь не проста жыве ў дзяржаве, а імкнецца ўдзельнічаць ва ўсіх працэсах: эканамічных, палітычных, грамадскіх. І тым самым імкнецца захаваць краіну, яе мір і спакой, гарманічнае развіццё.

### «ВАЖНА ЗАХАВАЦЬ ГРАМАДСКІ МІР І ЗГОДУ»

Сустракаючыся з маладымі выбаршчыкамі ў Авальнай зале Дома ўрада, Уладзімір Андрэйчанка расказаў удзельнікам форуму аб гэтым найважнейшым і знакавым месцы ў нашай краіне. Спікер ніжняй палаты парламента распавёў маладым людзям, што тут парламентарыі прымаюць законапраекты, абмяркоўваюць найважнейшыя пытанні грамадска-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага жыцця краіны. У гэтай зале перад дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў і членамі Савета Рэспублікі з Пасланнем беларускаму народу і парламенту выступае Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь. Менавіта сюды прыйдуць дэпутаты Палаты прадстаўнікоў восьмага склікання, якіх мы будзем выбіраць у адзіны дзень галасавання 25 лютага. Пакуль у Авальнай зале працуюць дэпутаты сёмага склікання.

«Наша дзейнасць прыпала на асаблівы перыяд у гісторыі сучаснай Беларусі — час прыняцця найважнейшых рашэнняў для будучыні нашай дзяржавы, — звярнуў увагу Уладзімір Андрэйчанка. — Дэпутаты актыўна ўдзельнічалі ў рабоце па правядзенні канстытуцыйнай рэформы, ініцыяванай кіраўніком дзяржавы. У рамках падрыхтоўкі прапаноў па карэкціроўцы Асноўнага Закона непасрэдна ў Палаце прадстаўнікоў было разгледжана больш за пяць тысяч ініцыятыў грамадзян. Парламентарыі працавалі ў складзе Канстытуцыйнай камісіі, абмяркоўвалі магчымыя навацыі на дыялогавых пляцоўках ва ўсіх рэгіёнах краіны».

Спікер ніжняй палаты парламента расказаў аб вялікай рабоце дэпутацкага корпуса па прывядзенні заканадаўства ў адпаведнасць з абноўленай Канстытуцыяй. Па словах Старшыні Палаты прадстаўнікоў, у адпаведнасць з Асноўным Законам прыведзена каля 90 законаў. Прыняты новыя законы — «Аб Усебеларускім народным сходзе» і «Аб асновах грамадзянскай супольнасці».

Як падкрэсліў Уладзімір Андрэйчанка, значнае месца ў рабоце парламентарыяў займаюць пытанні абароны суверэнітэту і незалежнасці Беларусі. «Вы бачыце спробы, якія прымаюцца ЗША і калектыўным Захадам, каб дэстабілізаваць унутраную сітуацыю ў краіне, дэзарганізаваць работу эканомікі, — канкрэтызаваў ён. — Таму дзейнічаць нам даводзілася хутка, аператыўна выпрацоўваючы ў адказ меры, у тым ліку заканадаўчага характару. Дэпутацкім корпусам прыняты законы, накіраваныя на барацьбу з тэрарызмам і экстрэмізмам, абарону права беларускага народа самастойна вызначаць шляхі свайго развіцця. Тым самым былі забяспечаны сацыяльны мір і згода ў грамадстве, што з'яўляецца найважнейшай умовай далейшага развіцця краіны».

Старшыня Палаты прадстаўнікоў расказаў маладым выбаршчыкам аб заканадаўчым забеспячэнні развіцця эканомікі і рэалізацыі ўзважанай сацыяльнай палітыкі дзяржавы. Дэпутатамі своечасова прыняты шэраг мер, накіраваных на супрацьдзеянне негатыўнаму ўплыву санкцый на паўсядзённае жыццё беларускіх грамадзян.

Уладзімір Андрэйчанка выказаў упэўненасць, што ўдзельнікі форуму — маладыя людзі з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй. «Ужо зусім хутка, у адзіны дзень галасавання, вам трэба будзе ўпершыню прыняць удзел у абранні дэпутатаў усіх узроўняў — выбраць дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і мясцовых Саветаў дэпутатаў, — нагадаў ён. — Не сумняваюся, што вы з усёй адказнасцю падыдзеце да свайго рашэння. Народнымі абраннікамі павінны стаць людзі, якія душой і сэрцам хвараюць за нашу краіну і зробяць усё, што ад іх залежыць для яе далейшага росквіту. Сёння як ніколі важна захаваць грамадскі мір і згоду. Толькі так мы зможам забяспечыць будучыню Беларусі як суверэннай і незалежнай дзяржавы».

**Уладзімір ВЯРЭНІЧ,**
**Вераніка КАНЮТА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Аргенціне паліцыя прымяніла слёзатачывы газ і вадамёт супраць пратэстоўцаў



Паліцыя Аргенціны прымяніла слёзатачывы газ супраць нязгодных з «шокавай» рэформай прэзідэнта краіны Хаўера Мілея, якая вядзе да значнага росту цэн. Аб гэтым паведаміла газета Nacion. Дэпутаты Аргенціны прыступілі да разгляду рэформаў. У гэты ж час каля будынка кангрэса пачалі збірацца пратэстоўцы. Для забеспячэння бяспекі была задзейнічана вялікая колькасць сілавікоў. Па меры працягу абмеркаванняў напружанасць каля будынка парламента пачала ўзрастаць, не абышлося без сутычак паміж праваахоўнікамі і пратэстоўцамі. «Актывісты паведамілі прэсе аб «пабоях» і прымяненні «слёзатачывага газу» з боку сілавікоў», — піша выданне. Як паведаміла Nacion, праваахоўнікі нават задзейнічалі грузавік з вадамётам. У выніку сутычак з сілавікамі былі затрыманыя як мінімум шэсць чалавек. Спікер ніжняй палаты парламента Марцін Менем адзначаў, што разгляд рэформаў можа заняць 3-4 дні.

### У Германіі скончыліся грошы для падтрымкі грамадзян



Ва ўрада Германіі не засталося грошай для фінансавай падтрымкі сваіх грамадзян. Як піша газета «Известия», пра гэта заявіў упаўнаважаны ўрада ФРГ па справах усходу краіны Карстэн Шнайдэр у эфіры шоу на тэлеканале Erste. Паводле яго слоў, федэральны ўрад выдаткаваў 800 мільярдаў еўра на выдзяленне дапамогі насельніцтву падчас пандэміі COVID-19 і на субсідыі, якія былі закліканы кампенсаваць значнае павышэнне цэн на газ і электраэнергію. Пасля ўсіх гэтых крокаў у Германіі больш няма грошай на далейшую падтрымку немцаў. Шнайдэр таксама заявіў, што «важныя інвестыцыі ў будучыню» немагчыма зрабіць з-за даўгавога тормазу. Ён выказаў меркаванне, што прыйшоў час грамадзянам Германіі «вяртаць грошы» ў бюджэт, маючы на ўвазе падаткі. У канцы мінулага года нямецкая газета Bild паведамляла, што сёлета ў ФРГ узнімуць падаткі на ацяпленне і паліва з-за недахопу бюджэту. Таксама будуць адменены падатковыя льготы на дызельнае паліва, што адаб'ецца на сельскай гаспадарцы і цэнах на прадукты харчавання.

### У Японіі ахвярамі землетрасенняў сталі больш за 230 чалавек



Землетрасенні назіраліся ў раёне паўвострава Нота на ўзбярэжжы Японскага мора, паведаміла ТАСС са спасылкай на ўлады прэфектуры Ісікава. Большасць загінулі ад удушша і пераахаладжэння пад заваламі, у асноўным гэта людзі старэйшыя за 60 гадоў. З 1 студзеня ў Японіі адбылося больш за 1,2 тысячы землетрасенняў. У выніку стыхіі пацярпелі больш за 1,1 тысячы чалавек, вакол былі разбураны 38,6 тысячы дамоў.

# КУЗНЯ БУДУЧЫХ ЧЭМПІЁНАЎ




**Лядовы палац, узведзены па даручэнні Прэзідэнта Беларусі, 31 студзеня адкрыты ў Светлагорску. Наваселле ў шматфункцыянальным спартыўным будынку адзначылі матчам дзіцячых каманд Гомельскай і Бранскай (Расія) абласцей.**

Сучасны спартыўны палац — доўгачаканая падзея не толькі для жыхароў буйнога райцэнтра, але і спартыўнага асяроддзя Гомельшчыны ў цэлым. У лядовым палацы ў Светлагорску цяпер ёсць магчымасць актыўна развіваць хакей з шайбай і фігурнае катанне.

Гонар палаца — лядовая арэна — класічная канадская пляцоўка памерам 60 на 26 метраў. Для яе абслугоўвання комплекс аснашчаны сучасным халадзільным абсталяваннем, сістэмай кандыцыяніравання, электроннымі лёдазалівачнымі камбайнамі. Сёння ў палацы прыняты на работу штатны трэнер, які праводзіць набор юных хакеістаў. Яны ўжо пачалі падрыхтоўку. Ёсць перспектывы і для культывавання ў раёне фігурнага катання.

Між тым у палацы будуць праходзіць і спартыўна-масавыя мерапрыемствы, спаборніцтвы, аздараўленчыя і вучэбна-трэніровачныя заняткі. Дарэчы, на лядовай арэне арганізуюць і масавае катанне на каньках для ўсіх ахвотных: прадугледжаны пакоі для захоўвання, завострывання, сушкі і выдачы канькоў.

У палацы, акрамя лядовай арэны, размясціліся залы харэаграфіі, акрабатыкі, адпрацоўкі кідкоў, навучальны клас, трэнерскія і судзейскія пакоі, раздзявальні для спартсменаў, а таксама трэнажорная зала плошчай 180 «квадратаў».

Ва ўрачыстай цырымоніі адкрыцця новага спартыўнага аб'екта ў Светлагорску прынялі ўдзел старшыня Гомельскага аблвыканкама Іван Крупко і губернатар Бранскай вобласці Аляксандр Багамаз. Кіраўнікі беларускага і расійскага рэгіёнаў асабіста апрабавалі магчымасці і абсталяванне кідковага пакоя палаца.

— Сёння ў спартыўнай гісторыі Светлагорска адкрылася новая цікавая старонка. Горад атрымаў для развіцця зімовых відаў спорту сучасную лядовую арэну, — павіншаваў жыхароў і гасцей райцэнтра **старшыня Гомельскага аблвыканкама Іван КРУПКО**.

Як падкрэсліў кіраўнік рэгіёна, адкрыццё чаканага спартыўнага аб'екта дапаможа рыхтаваць перспектыўных спартсменаў, гульцоў прафесійных каманд. Лядовы палац — выдатная магчымасць карысна і цікава праводзіць час усім ахвотным аматарам здаровага ладу жыцця.

Павіншаваў жыхароў Гомельшчыны і **губернатар Бранскай вобласці Расіі Аляксандр БАГАМАЗ**. Па словах кіраўніка расійскага рэгіёна, сімвалічна, што самыя маленькія хакеісты Гомельскай і Бранскай абласцей першымі апрабавалі лёд новенькай светлагорскай арэны. Тут прайшоў сяброўскі матч паміж дзіцячымі камандамі беларускага і расійскага рэгіёнаў.

— Я як балельшчык і мы ўсе хваляваліся. Гэта была годная гульня дзвюх каманд, — падзяліўся ў размове з журналістамі губернатар Бранскай вобласці. — Самае галоўнае, заўжды падкрэсліваю, што хлопцы, якія сёння гулялі, — будучыня нашых краін. Яны не толькі хакеісты — гэта і будучыя кіраўнікі раёнаў, абласцей, будучыя міністры, прэзідэнты, магчыма. У нас працуе шмат праграм сярод школьнікаў, каля ста мерапрыемстваў мы правялі за мінулы год — каб дзеці і спаборнічалі, і сябравалі потым на жыцці.

Прывітаць жыхароў горада і павіншаваць з адкрыццём лядовага палаца ў Светлагорск з хакейнай камандай прыехаў **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Дзмітрый БАСКАЎ**. Ён падзяліўся, што, без сумненняў, Светлагорск абяцае стаць хакейным цэнтрам прыцягнення.

— І наступны раз мы прыедзем сюды ўжо глядзець на мясцовых дзяцей, якія будуць радаваць нас сваімі перамогамі. Бо пабудаваць лядовы палац — адно, а насыціць яго жыццём — зусім іншае. Перакананы, што ў жыхароў, кіраўніцтва горада гэта атрымаецца, — адзначыў Дзмітрый Баскаў.

Парламентарый чарговы раз нагадаў, наколькі значная ўвага ўдзяляецца сацыяльнай дзяржаўнай палітыцы ў нашай краіне.

— Будаўніцтва такога роду аб'ектаў — у тым ліку яе неад'емная частка, неабходная для развіцця новага пакалення беларусаў. Давайце згадаем пачатак двухтысячных гадоў, калі па даручэнні Прэзідэнта пачалі будаваць лядовыя палацы. Сёння мы бачым тое пакаленне беларусаў з розных рэгіёнаў, якія трапляюць у найлепшыя каманды НХЛ, вялікую колькасць дзяцей, якія выйграюць міжнародныя спаборніцтвы, — падкрэсліў Дзмітрый Баскаў.

Між тым сёлета на Гомельшчыне плануецца справіць наваселле шэрагу спартыўных комплексаў — узводзяцца стадыёны ў гарадскім пасёлку Карма, у Нароўлі, запланавана адкрыццё ўнікальнага для рэгіёна палаца гульнявых відаў спорту ў Мазыры.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота ТГ-канала «Гомельшчына афіцыйна».**

# ДНК ЯЛОВАЙ ШЫШКІ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

— Гэта гарантыя лепшай усходжасці і ўстойлівасці, — тлумачыць наш гід **галоўны лясніча Горацкага лясгаса Аляксей ЗУЁНАК**. — Мы атрымліваем шышкі з плюсавых дрэў. Гэта значыць, з прышчэпленых вегетатыўным спосабам чаранкамі ад лепшых дрэў па краіне. У Беларусі ёсць рэестр плюсавых дрэў. Гэта тыя асобнікі, якія падчас свайго росту і развіцця паказваюць найбольш каштоўныя характарыстыкі — рост, памер, дыяметр, вышыню. Інстытут лесу вядзе пастаянны адбор па гэтых дрэвах. Іх заносяць у асобны рэестр, кожнаму дрэву прысвойваецца нумар, і з яго наразаюцца чаранкі, якія потым прышчэпліваюцца. Робіцца гэта для таго, каб дрэва на плантацыі давала лепшае насенне.

Прызнаюся: дагэтуль не ўяўляла ўсю важнасць работы з шышкамі. Здавалася, што дрэвы самі здольныя паклапаціцца пра сябе. Упадзе пад дрэвам семечка, пройдзе час і вось праклюнецца невялічкім зялёным саджанцам, а потым ператворыцца ў прыгожае, раскідзістае дрэва.

— Не факт, — кажа спецыяліст. — У пітомніку мы, умоўна кажучы, пасеялі 60 кілаграмаў, а ў лесе прасыпалася 500 кілаграмаў на гектар. Зразумела, у апошнім выпадку будзе складаней ўражанне, што там расце лепш. Але ж мы не ведаем, колькі семечак упала і колькі выжыла.

## НАВОШТА ПАЛОЦЬ ТРАВУ Ў ЛЕСЕ

Пытанне, як той казаў, на засыпку. Але трэба ведаць тэхналогію. Плантацыі — гэта месцы, дзе створаны ідэальныя ўмовы для росту дрэва з мэтай фарміравання максімальнай колькасці «пладоў», у дадзеным выпадку шышак. І для дрэў там ствараюцца ўмовы не абы якія, а элітныя. Пакуль ехалі да месца, уяўляла сабе густы яловы лес, дзе лясныя прыгажуні як на падбор. Убачанае, мякка кажучы, расчаравала. Елкі як елкі, некаторыя нават крывыя і рэдкія.

**Ляснічы першага класа Цемналескага лясніцтва Аляксандр АНІШЧАНКА**, які тут гаспадарыць, тлумачыць:

— Тут задачы крыху іншыя. Мы вырошчваем елкі не для прыгажосці, а для таго, каб яна давала добрае насенне. Для нас галоўнае атрымаць як мага больш шышак. Да таго ж дрэўцы яшчэ досыць маладыя.

Дзеля таго каб шышка адпавядала ўсім стандартам, нельга адступаць ад тэхналогіі. Тут трэба правільна пасадзіць будучае дрэўца, даглядаць яго, падразаць, песціць і зберагаць. Як таму аграному, без чыёй самаад-данай працы хлеба не будзе. Толькі тут увесь цяжар работы бяруць на сябе леснікі.

У абавязкі Аляксандра Анішчанкі ўваходзіць і апрацоўка ўчастка супраць шкоднікаў, ён гэта робіць чатыры разы ў год. Тая ж пядзеніца — на выгляд прыгожы матылёк, за якім так прыемна назіраць у лесе. Насамрэч прыгажуня ў стадыі вусеня вельмі моцна псуе хвою. Акрамя пядзеніцы хапае і іншых, якім таксама падабаецца смак елак. Калі не адпужваць, з'ядуць усе іголкі. І тады пра шышкі можна будзе забыцца.

Не любяць елкі таксама, калі вакол іх буяе трава. «Прыходзіцца касіць, — кажа суразмоўнік. — Інакш галіны будуць цягнуцца ўгору і радыус іх размаху будзе вузкі. А калі дрэўцы зусім яшчэ маленькія, нават прапалку робім. Каб трава іх не заглушыла».

Калі дрэва, нягледзячы на ўсе старанні леснікоў, усё ж такі не выжывае, восенню ці вясной, калі зямля найбольш вільготная, дасаджваецца маладзейшыя. Наогул тэрмін службы дрэў, што на лесанасенной плантацыі, каля 40 гадоў, далейшае яго жыццё вызначае камісія. Калі ўсё адпавядае патрабаванням, перыяд працягваецца.

Па перыметры яловай пляцоўкі — бярозы. Гэта для таго, каб элітныя елкі не апыляліся звычайнымі, якія растуць непадалёк. Па слупках можна давядацца, калі якую партыю саджалі. Захоўваецца і пэўная схема пасадкі, кожнае дрэва ідзе пад нумарам.

Па маршруце заязджаем яшчэ на невялічкую дзялянку, дзе пасаджаны елкі з семечак вось гэтай цемналескай плантацыі. Ім толькі чатыры гады, і яны пад асаблівым наглядам.

Збор шышак пачаўся ў снежні і павінен закончыцца да сакавіка. На плантацыі, дзе мы пабывалі, ён ужо завяршыўся. Аляксандр Анішчанка з гонарам адзначыў, што яго леснікі сабралі за снежань 900 кілаграмаў. Улічваючы, што тут дастаткова маладыя дрэўцы, вынік добры.

У Аляксандра Анішчанкі і яго падначаленых сёння іншыя клопаты. Трэба яшчэ кожную елачку краніраваць, каб яна не марнавала свае сілы на непатрэбную ёй работу. Дарэчы, гэта адна з прычын, чаму елкі на плантацыі не вельмі прыгожыя. Іх місія больш значная — аздараўліваць сваім насеннем будучыя лясы.

## АЙДА ЗА ШЫШКАМІ

Прычыніцца да збору шышак атрымалася ў Расянскім вопытна-вытворчым лясніцтве. У першую чаргу вядзецца збор менавіта палепшанай шышкі. І толькі калі па плане не хапае аб'ёмаў, у ход ідуць звычайныя. Гэта якраз той выпадак. Елкі не элітныя, вымахалі па пяць метраў у вышыню. Знізу бачна, якія прыгожыя гронкі шышак на іх вісяць, але без спецыяльнага прыстасавання да іх не дабярэшся. Леснікі задзейнічалі ў зборы шышак тэхніку. Ляснікавальшчык Андрэй Валчок у поўнай амуніцыі і з каскай на галаве выконваў складаную работу наўпрост з пад'ёмніка. У сярэднім на вышыні за дзень яму трэба сабраць 17 кілаграмаў.

Калі мяшок шышак быў поўны, ён з пачуццём выкананага доўгу расказаў, што яго работа хоць і складаная, але вельмі яму падабаецца. Таму ён у ёй ужо 25 гадоў.

Сёлета леснікі са зборам шышак спраўляюцца самастойна, але бывае, што прыходзіцца звяртацца да насельніцтва.

— Год быў для нас не вельмі ўраджайны, — прызнаецца Аляксей Зуёнак. — Здаецца, і цвілі ня́дрэнна, спадзяваліся на ўраджай шышак, але працяглы перыяд — каля 50 дзён — без ападкаў — адбіўся на пладанашэнні. Таму сёлета абышліся без дапамогі насельніцтва. А ва ўраджайныя гады запрашаем лесанарыхтоўчыкаў збоку.

## ЦЭХ ПА ВЫПРАЦОЎЦЫ ФІТАНЦЫДАЎ

Гэта такое ўражанне складаецца, калі сюды заходзіш. Правільна ён называецца цэх па перапрацоўцы лесанасенной сыравіны. Але ад паху, які тут стаіць, кружыцца галава. Шышкі пасля збору адпраўляюцца менавіта сюды, каб прайсці працэс сушкі.



У такіх умовах, напэўна, вельмі карысна працаваць у грыпозны перыяд. **Начальнік гадавальніка Горацкага лясгаса Таццяна ГАРУСАВА** пагаджаецца, што яе работа звязана з гаючым пахам.

У сушылцы 30 скрынь, якія могуць умясціць 180 кілаграмаў шышак. Цяпло падаецца ад кацельнай на дровах. У камерах падтрымліваецца тэмпература каля 60 градусаў. Для таго каб раскрылася шышка, неабходна ад 24 да 48 гадзін.

— Шышкі паступаюць да нас з 13 лясгасаў Магілёўскай вобласці і аднаго — Аршанскага, — удакладняе Таццяна Гарусава. — Калі шышкі раскрываюцца, мы з дапамогай спецыяльнага абсталявання абяскрыльваем насенне і аддзяляем ад няякасных семечак. Потым сартуем, пакуем, а пробы адсылаем у Рэспубліканскі лясны селекцыйна-насеннягодчы цэнтр у Мінск, дзе ім прысвойваецца клас якасці. Чым ён вышэй, тым лепш усходжасць і рост. За мінулы сезон мы перапрацавалі 51 тону шышак, атрымалі каля 650 кілаграмаў насення.

Гатовае насенне расфасоўваецца ў пакеты, якія запайваюцца. На кожную партыю ствараецца этыкетка, дзе ўказваецца год закладкі, маса, а таксама кандыцыйная якасць. Шлях шышкі, дакладней, ужо яе насення, заканчваецца ў халадзільніку Горацкага лясгаса. Сёння тут захоўваецца 4900 кілаграмаў насення. Пры тэмпературы -2 °С яны змогуць яшчэ доўгі час не страчваць кандыцыйнасці і пасяўных якасцяў.

— Шышку мы збіраем для таго, каб стварыць неабходны запас, — удакладняе **начальнік аддзела Магілёўскага лесагаспадарчага аб'яднання Вячаслаў ГАЛАЎНЁЎ**. — З дапамогай халадзільнікаў яно можа захоўвацца 10 гадоў. Калі б семечкі проста ўпалі на зямлю і засталіся там ляжаць, яны б страцілі ўсходжасць. А тыя, што ляжаць у халадзільніку, — наш стратэгічны запас.

Дарэчы, сёлета па вобласці плануецца нарыхтаваць да 50 тон сасновай і яловай шышкі, у тым ліку з лесанасенных плантацый каля 30 тон.

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
**фота аўтара.**

*Горацкі раён.*

На адной хвалі

# Спыніць катастрофу



**Працяг прыгод ужо вядомага Тошкі і яго сяброў можна ўбачыць з лютага ў ранішнім эфіры тэлеканала «Беларусь 3» у мультыплікацыйным фільме «Тошка і яго сябры. Дапоўненая рэальнасць. Перазагрузка».**

Мультфільм выйшаў летась на кінастудыі «Беларусьфільм». Яго рэжысёр-пастаноўшчык Аляксандр Ленкін, які з'яўляецца і аўтарам сцэнарыя ў тандэме з Канстанцінам Андрушачкіным, і творчая каманда зрабілі працяг гісторыі пра любімага многімі казачнага героя. Ён — наш нацыянальны сімвал — звычайная бульбіна. Тошка нарадзіўся пад вялікім бульбяным кустом у сям'і Бульбашоў. Разам са сваімі сябрамі гэты персанаж спрытна вырашае самыя розныя, часам вельмі нечаканыя, жыццёвыя сітуацыі. У працягу гісторыі гледачы ўбачаць, як кампанія, гуляючы ў акулярах дапоўненай рэальнасці, ламае ў парку зялёныя насаджэнні. І каб выправіць сітуацыю, на дапамогу Тошку і яго сябрам прыходзіць Дзед Бульбаш. Ён сканструіраваў робата, якога героі павінны навучыць клапаціцца аб навакольным асяроддзі. І тым самым выправіць наступствы сваёй гульні. Толькі вось у працэсе праграмавання робат выходзіць з-пад кантролю дзяцей і маштабы беспарадку павялічваюцца... Ці ўдасца юным героям зноў узяць пад кантроль сітуацыю і якія высновы яны зробяць пасля гэтай прыгоды, — даведаецеся падчас прагляду мультфільма.

**Алена ДРАПКО.**

## ШАШКІ

(«Звязда») Выпуск № 210

З 19 да 28 студзеня ў Рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі па шахматах і шашках адбыліся чэмпіянаты Беларусі па шашках-64 сярод мужчын і жанчын. Вельмі напружаная барацьба вялася да апошняга туру.

У жаночым чэмпіянаце упершыню перамагла міжнародны майстар з Гродна Эма Саўрас. Яна выйграла восем матчаў, у тым ліку і над дзеючай чэмпіёнкай свету Вікторыяй Нікалаевай, якая была вымушана задавольвацца сярэбраным медалём. На трэцім месцы міжнародны майстар з Мінска Дар'я Нікіфарава.

У мужчын перамог 16-гадовы міжнародны майстар з Ваўкавыска Арцём Ціханаў. Ён атрымаў восем перамог і пяць матчаў звёў у нічыю. Юны чэмпіён здолеў апярэдзіць пяць міжнародных гросмайстраў. Сярэбраны медаль дастаўся міжнароднаму гросмайстру Ігару Міхальчанку (Ваўкавыск). Бронза ў дзеючага чэмпіёна свету Андрэя Валюка (Мінск). Прыгожую камбінацыю правёў новы чэмпіён краіны ў наступнай партыі.

Бокі П. — Ціханаў А.

1. c3-d4 d6-e5 2. b2-c3 e7-d6 3. g3-f4 e5xg3 4. f2xh4 b6-a5 5. h2-g3 c7-b6 6. g1-h2 h6-g5 7. g3-f4 g7-h6 8. c1-b2 f8-e7 9. f4-e5 d6xf4 10. a3-b4 b8-c7 11. e1-f2 *Глядзіце дыграму № 17.*

Паспрабуйце адшукаць разгромную камбінацыю за чорных самастойна.

№ 17





**№ 17**

**Белыя простыя:** a1, b2, d2, f2, h2, c3, e3, b4, d4, h4 (10)

**Чорныя простыя:** f4, a5, g5, b6, f6, h6, a7, c7, e7, d8, h8 (11)

19 студзеня на 65 годзе пайшоў з жыцця Вадзім Булат — майстар спорту, экс-прэзідэнт Беларускай федэрацыі шашак, аўтар кніг, вядомы шашачны кампазітар, вядучы аддзелаў шашак у розных выданнях. Сённяшнія кампазіцыі прысвячаюцца яго памяці.

**№ 18** В. Арцюхін (Мінск)

**Белыя простыя:** d2, f2, e3, g3, g5 (5)

**Чорныя простыя:** b2, a3, e5, f6, e7, дамка a1 (6)

**№ 19** В. Свізінскі (Мінск)

**Белыя простыя:** d2, c3, e3, g3, f4, h4, дамка e1 (7)

**Чорныя простыя:** c5, g5, b6, d6, f6, h6, g7, дамка a5 (8)

**№ 20** В. Варушыла (Мінск)

**Белыя простыя:** a1, e1, f2, h2, e3, g3, e5 (7)

**Чорныя простыя:** a3, c3, d4, c5, g5, h6, a7, c7 (8)

**№ 21** Я. Капылоў (Белград)

**Белыя простыя:** 46, 42, 26, 27, 30, 22, 25, дамка 31 (8)

**Чорныя простыя:** 43, 36, 33, 29, 23, 16, 6, 7, 8, 10, дамка 37 (11)

**№ 22** В. Варушыла

**Белыя простыя шашкі:** 47, 48, 42, 38, 40, 31, 32, 34 (8)

**Чорныя простыя шашкі:** 45, 26, 29, 23, 25, 19, 20, 9, 10 (9)

Астатнія кампазіцыі склаў Г. Андрэеў (Латвія) па правілах бразільскіх шашак.

**№ 23**

**Белыя простыя:** a1, c1, c3, g3, b4, f4 (6)

**Чорныя простыя:** h2, a3, d4, e5, d6, h6, c7 (7)

**№ 24**

**Белыя простыя:** g3, b4, f4, c5, g5, b6, d6, f6 (8)

**Чорныя простыя:** d2, a3, e3, d4, h6, b8, d8, f8 (8)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Празвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

**Праверце свае рашэнні:** выпуск № 209 ад 19.01.2024.

№ 9 1. c5-d6 a7:c5 [ 1...g3:e1 2. d6:f8 a7:c5 3. f8:d2 e1:c3 4. c1-d2 c3:e1 5. g1-f2 e1:g3 6. h4:f2 ] 2. d6:f8 g3:e1 3. f8:d2 e1:c3 4. c1-d2 c3:e1 5. g1-f2 e1:g3 6. h4:f2 +

№ 10 1. c1-d2 a3:g5 2. h4:d8 c5:a3 3. a7:e7 f8:d6 4. h6:b4 a3:c5 5. d8:g1+

№ 11 1. e7-f8 c5:e7 2. f8:h6 a3:c5 3. f2-g3 h2:d2 4. h6:c1 c5:e3 5. c1:a5+

№ 12 1. 26-21 27:07 2. 12:01 23:21 3. 29-24 36:18 4. 01:03 20:29 5. 03:50+

№ 13 1. 16-11 27:07 2. 12:01 23:21 3. 29-24 36:18 4. 01:45 20:29 5. 45:37+

№ 14 1. e1-d2 c3:g3 2. h2:d6 h6:d2 3. d6-c7 b8:d6 4. a7-b8 c5:a7 5. b8:e3+

№ 15 1. a7-b8 c3:g3 2. b8:c1 g3-f2 3. h2-g3 f2:h4 4. c1-f4 h6-g5 5. f4:h6 h4-g3 6. h6-e3 g3-h2 7. e3-g1+

№ 16 1. c7-b8 c3:g3 2. b8:a3 g3-f2 3. h2-g3 f2:h4 4. a3-d6+

З лістоў чытачоў: «Дзякуем за цікавы матэрыял, рашэнне якога даставіла нам вялікую асалоду, а таксама за агляд шашачнага жыцця краіны», — пішуць Ф. Карпей і Л. Жыхар.

Першымі дакладныя адказы даслалі: С. Рашэцін (Ашмяны), В. Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.), Э. Дамброўскі, П. і В. Шульгі, (усе Мінск), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва Мядзел), У. Ваўчкоў (Маладзечна), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна).

Пішыце на адрас: газета «Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Наша кіно

# ЛЁС КОЖНАМУ ЗНАХОДЗІЦЬ ШЧАСЦЕ

**20.15** «Капітальныя дэталі».
**20.25** «Міншчына».
**20.40** «Ствараем разам».
**20.55 «Неўскі. Цень Архітэктара». Серыял (16+).**
**23.20** «Азаронак. Напрамую».
**0.55** Дак. праект. Дзевяностыя (16+).

## МІР

**5.00 Тэлесерыял «Школа выжывання ад адзінокай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу» (12+).**
**6.00, 10.00, 13.00, 16.00, 18.30** Навіны.
**6.15** [Не]Фантастыка (12+).
**6.25, 10.10, 17.05** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**8.05, 11.05, 14.10** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**9.00, 12.00, 15.05** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**13.15** «Міравое пагадненне» (16+).
**16.15** «Справы судовыя. Яблык разладу» (16+).
**18.50** «Мільён за 5 хвілін» (16+).
**19.30 Маст. фільм «Чалавек-амфібія» (16+).**
**21.35 Маст. фільм «Дзеці панядзелка» (16+).**
**23.35 Маст. фільм «Дамы запрашаюць кавалераў» (16+).**
**1.10 Маст. фільм «Чыста англійскае забойства» (16+).**
**3.50** «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (16+).
**4.15 Маст. фільм «Музычная гісторыя» (16+).**

## РТР—Беларусь

**6.00, 9.00, 11.30, 14.30, 17.30, 21.00, 23.00** Беларусь. Навіны.
**6.05, 9.05** «Новая раніца».
**10.05 Тэлесерыял «Таямніцы следства» (12+).**
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Пра самае галоўнае» (12+).
**12.50** «Кропкі над і» (16+).
**14.40** «60 хвілін».
**17.40** «Дакрананне да свята».
**17.55 Серыял «Марозава» (16+).**
**18.55** «Прамы эфір» (16+).
**21.30, 23.15 Фільм «Два берагі надзеі» (12+).**
**0.15 Камедыя «Дуэння» (16+).**

## НТБ—Беларусь

**6.10** «Астрапрагноз».
**6.15, 7.10, 8.25, 13.20, 22.50, 23.30** Сёння. Галоўнае.
**6.20** «Здарова здаровым быць!» (6+)
**7.25** Гісторыі выратавання (12+).
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.40** «НЗ.by».
**8.55** Сфера інтарэсаў.
**9.15** «Зламаць стэрэатыпы» (12+).
**9.35, 10.35, 13.55 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў» (16+).**
**13.30** Надзвычайнае здарэнне.
**14.55** «Чакай мяне» (12+).
**16.40, 20.00** Галоўнае. Сёння. Беларусь.
**16.55 Серыял «Пёс» (16+).**
**20.15, 21.50 Серыял «Шэф. Мужчынская работа» (16+).**
**21.20** «НЗ.by: час вынікаў».
**22.55, 23.45 Дэтэктыў «Спецбат» (16+).**

## 8 канал

**7.00, 21.00** «Надвор'е».
**7.05** Мультпарад.
**7.25** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**7.30 Фэнтэзі «Паміж небам і зямлёй» (12+).**
**9.05** Дак. экран.
**10.00 Баявік «Фарсаж-5» (16+).**
**12.10 Серыял «Яна напісала забойства» (12+).**
**12.50 Драма «Процістаянне» (12+).**
**14.45 «Драма». «Дачка правадыра» (16+).**
**16.25 Камедыя «Каралева Чхорын».**
**17.45, 19.15** «Надвор'е» + «Эрана».
**17.50 «Дэтэктыў. Крымінал».**
**19.20 «Пры загадкавых абставінах».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «Урокі Лазуркіна».
**21.10 «Лузер» (16+).**
**22.45 «Астэрыкс і Абелікс. Місія «Клеапатра».**
**0.30** «Начны серыял».



## Культура

**6.30** «Пешшу...»
**7.00** «Вайна Ніны Сазонавай».
**7.15, 20.05** «Першы Універсітэт». Дак. фільм.
**7.55** «Почырк эпохі».
**8.25** «Жыццё і лёс».
**8.45, 22.10** «На ўсё астатняе жыццё...» Маст. фільм.
**10.00, 12.30, 17.00, 19.30, 0.00** Навіны культуры.
**10.15** «Назіральнік».
**11.10, 1.15** «Тэлетэатр. Класіка».
**12.10** Колер часу.
**12.45** Навіны. Падрабязна.
**13.00** Штучны адбор.
**13.45, 14.05, 14.25, 0.15, 0.35, 0.55** «Порус». Тэлесерыял.
**14.45** «Выпадак Пантэкорва». Дак. фільм.
**15.30, 23.15** «Заўтра не памрэ ніколі». Дак. серыял.
**16.15** Астравы.
**17.15** «Біблейскі сюжэт».
**17.45** Майстры фартэпіяннага мастацтва.
**18.30** «Забытае рамяство». Дак. серыял.
**18.45, 2.10** «Вежа». Дак. серыял.
**19.45** «Галоўная роля».
**20.45** «Абсалютны слых».
**21.25** Улада факта.

## Настальгія

**6.00** «Сто пытанняў да дарослага» (16+).
**6.40** «Ад смешнага да вялікага. Аркадзь Арканаў» (16+).
**7.25** Маст. фільм «Уцёкі Тарзана» (16+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**9.40, 11.30, 12.45, 14.50, 15.40, 17.35, 20.35, 21.40, 23.30, 1.20, 3.40, 5.30** Музычная настальгія (12+).
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**11.00, 17.00, 23.00, 5.00** «Блеф-клуб» (16+).
**12.00** «Быў час» (16+).
**13.00** Маст. фільм «Грандатэль» (16+).
**18.00** «Спяем, сябры!» (16+)
**19.05** Маст. фільм «Новы Арлеан» (16+).
**0.00** Маст. фільм «Шанхайскі экспрэс» (16+).
**1.50** Канцэрт гурта «Пушкінг» (16+).

## EuroSport 1

**3.30, 5.00, 6.30, 22.30** Горныя лыжы. Кубак свету, Гарміш-Партэнкірхен. Жанчыны.
**8.00, 21.10, 21.45** Горныя лыжы. Кубак свету, Шамані. Мужчыны.
**8.30** Снукер.
**10.30** Біятлон. Кубак свету, Хохфільцэн. Жанчыны.
**11.00** Біятлон. Кубак свету, Ленцэрхайдэ. Жанчыны.
**11.30** Біятлон. Кубак свету, Ленцэрхайдэ. Мужчыны.
**12.00** Біятлон. Кубак свету, Аберхоф. Мужчыны.
**12.45** Біятлон. Кубак свету, Аберхоф. Жанчыны.
**13.30** Біятлон. Кубак свету, Рупольдынг. Жанчыны.
**14.00** Біятлон. Кубак свету, Рупольдынг. Мужчыны.
**14.30** Біятлон. Кубак свету, Антхольц. Жанчыны.
**15.10, 18.15** Біятлон. Кубак свету, Антхольц. Мужчыны.
**15.40, 0.30** Велакрос. Ethias Cross Малдэгем. Жанчыны.
**16.45** Велакрос. Чэмпіянат свету. Мужчыны.
**16.55, 1.15** Велакрос. Ethias Cross Малдэгем. Мужчыны.
**18.50, 23.00** Біятлон. Чэмпіянат свету, Нове-Места. Мікст.
**2.00** Веласпорт. «Вуэльта Валенсіі». Мужчыны.

## Кінакамедыя

**0.35** «Эйр Амерыка» (16+).
**3.35** «Прышэльцы-2: калідоры часу» (12+).
**5.45** «Таксі» (16+).
**7.25** «Таксі-2» (16+).
**9.00** «Скарбы джунгляў» (18+).
**10.35** «Жаніх» (12+).
**12.20** «Нянькі» (12+).
**14.05** «Аднакласнікі» (12+).
**15.55** «Асаблівасці нацыянальнай рыбалкі» (16+).
**17.50** «Лена і справядлівасць» (12+).
**19.30** «Вельмі дрэнная вучылка» (18+).
**21.10** «Непаслушнік» (12+).
**23.20** «Прыгажунчык са стажам» (16+).

## ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**9.05** «Містычныя гісторыі» (16+).
**10.00, 16.00** «Стой! Не тое маці будзе варажыць» (16+).
**11.00** «Глядзі сам» (16+).
**11.20, 17.00** «Цудоўнае стагоддзе» (16+).
**13.05, 18.45, 3.00** «Сляпая» (16+).
**14.30, 20.15, 3.45** «Варажбітка» (16+).
**21.45** «Доказы з мінулага» (16+).
**23.25** «Твой свет» (16+).
**0.20** «Дзённік экстрасэнса» (16+).
**1.15** «Я, робат» (16+).
**4.30** «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).

## ТБ1000

**6.15** Прынцэса Манака (16+).
**7.55** Дзіяна: гісторыя кахання (12+).
**10.05** Спенсер (16+).
**12.10** Кароль кажа! (16+)
**14.30** Анжаліка, маркіза анёлаў (16+).
**16.50** Цудоўная Анжаліка (16+).
**19.00** Русалка і дачка караля (12+).
**20.50** Беласнежка: помста гномаў (12+).
**22.50** Прыгажуня і пачвара (12+).
**1.00** Планета Ка-Пэкс (12+).
**2.50** Прыстанак праклятых (16+).
**4.35** Востраў праклятых (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**5.30** Пін-код (6+).
**6.50** Тры каты (6+).
**7.25** Смяшарыкі (6+).
**8.10** Параграф 78: фільм першы (16+).
**9.50** Параграф 78: фільм другі (16+).
**11.30** Сволачы (16+).
**13.20** Зацьменне (12+).
**14.55** Мацільда (16+).
**17.00, 17.45** След (16+).
**18.25** Аванпост (16+).
**21.00** Ціхая застава (16+).
**22.45** Зіма (16+).
**0.05** Вартаўнік (16+).
**1.50** Адчайныя дольшчыкі (16+).
**3.15** Цвярозы кіроўца (16+).
**4.50** Пеця і Чырвоная Шапачка (6+).
**5.10** Кветачка-Сямікветачка (6+).

## National Geographic

**6.10, 5.15, 5.40** Навуковыя глупствы (12+).
**6.30** Самыя лепшыя суперкары (12+).
**7.15, 8.00** Міжнародны аэрапорт Дубай (12+).
**8.45, 9.30, 0.45, 1.30** Асушыць акіян (12+).
**10.15, 11.00, 11.50** Тайная гісторыя караблекрушэнняў (12+).
**12.35, 21.00, 21.45** Унутры аэрапорта Сіднэй (12+).
**13.20, 14.05, 14.50, 2.15, 3.00, 3.45, 4.35** Расследаванні авіякатастроф (12+).
**15.40, 16.25** У пагоні за НЛА (12+).
**17.10, 17.55, 18.45, 19.30, 20.15** Уварванне на Зямлю (12+).
**22.30, 23.15, 0.00** Служба бяспекі аэрапорта: Рым (12+).

## ЯСНАе

**5.10** «Смяротная схватка».
**6.45** «Мужчынская работа 2».
**8.20** «Раніца ЯСНАЯ».
**9.25** «Аперацыя «Гаргона».
**11.00** «Марскія д'яблы».
**12.35** «Баранцава мора».
**14.25** «Сляпы-2».
**16.00** «Запаведны спецназ».
**17.40** «Шэф. Новае жыццё».
**19.15** «Крэмень. Вызваленне».
**21.00** «Чалавек і здароўе».
**21.20** «Неадкладнае рэагаванне».
**23.00** «Шчыт айчыны».
**0.25** «Сыны ідуць у бой».
**2.00** «Загад».
**4.10** «На самай справе».
**4.30** «Полымя пад попелам».

## Звязда

**6.00** «Беларускі вердыкт. Сябры і ворагі Фрыца Шменкеля». Дак. фільм (12+).
**6.30** «Ад Рузвельта — Сталіну. Беларусы ў справе на мільярд». Дак. фільм (12+).
**7.00, 19.30, 23.00** «Навіны».
**7.20** «Рубікон».
**7.30, 21.40** «Як гартавалася сталь». Маст. фільм (12+).
**8.35, 14.05** «Дзяржаўная граніца. «Мы наш, мы новы...» Маст. фільм (12+).
**10.50, 11.35, 18.00, 18.45** «Кедр пранізвае неба». Серыял (16+).
**12.20, 13.10, 19.50, 20.45** «Ваенная разведка. Паўночны фронт». Серыял (16+).
**16.20, 17.05** «М.У.Р. 1944». Серыял (16+).
**19.45, 23.15** «Навіны ў форме».
**22.45** «Паміж мірам і вайной. Знайдзі мяне, мама». Дак. фільм (12+).
**23.20** «Партызанская мяжа». Дак. фільм (12+).
**0.15** «Джульбарс і Дзіна. Сабакі службы «Д». Дак. фільм (12+).
**0.45** «Дзеці Камінтэрна. Выратаваныя ў Беларусі». Дак. фільм (12+).
**1.15** «Друкаваны фронт. Газеты стралялі ва ўпор». Дак. фільм (12+).
**1.45** «Ілья Мурамец». Перарваны палёт». Дак. фільм (12+).
**2.15** «Ваеннапалонныя. Вінаватыя, калі выжылі». Дак. фільм (12+).
**2.45** «Фаня Алер. Вайна без антракту». Дак. фільм (12+).
**3.40** «Георгій Жукаў. Ад рэкорду да парада». Дак. фільм (12+).
**4.10** «А-229. Сакрэтная зброя Крамля». Дак. фільм (12+).
**4.40** «Аперацыя «Зорачка». Двойчы выратаваныя». Дак. фільм (12+).

*У праграме магчымыя змяненні.*
*Перадрукоўка праграмы забароненая.*
*[СЦ] – фільм трансліруецца са скрытымі субцітрамі.*

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.35** Зона X (16+).
**9.10** «Здарова здаровым быць!» (6+)
**10.00, 11.50, 12.15, 13.05 Меладрама «Адзіная радасць» (12+).**
**10.50** «Скажынемаўчы».
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**15.25, 22.20 Серыял «След» (16+).**
**17.05** Беларуская часінка.
**18.30, 19.20 Меладрама «Шчасце не за гарамі» (16+).**
**21.00** Панарама.
**21.45** Беларуская супержанчына.
**21.55** Адзін дзень (12+).
**0.15** Сфера інтарэсаў.
**0.50** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**10.00, 16.55** Тэлебарометр.
**10.05, 18.05** «Сляпая» (16+).
**10.35, 18.35 Дэтэктыў «Свае» (16+).**
**12.05** Я з вёскі (12+).
**12.35, 22.15 Дэтэктыў «Мажор» (16+).**
**14.30** «Разумны дом» (12+).
**15.15** «Аб здароўі: жартам і сур'ёзна» (16+).
**15.45** Мультсерыял «Маша і Мядзведзь» (0+).
**15.55** Нічога сабе ньюз (12+).
**16.00** «ПІН_КОД» (12+).
**17.00** «Гастратур» (16+).
**17.50** «Карысная праграма» (16+).
**20.10 Серыял «Жукі. Фінал» (16+).**
**21.10** Спартлато 6 з 49, КЕНА.
**21.15 Серыял «Івановы-Івановы» (16+).**

## Беларусь 3

**7.00** «Дабранаранак».
**7.35, 12.30** «Беларуская кухня».
**8.05, 13.00, 20.30, 23.45** «Навіны культуры».
**8.15, 21.05 «Бярозка». Маст. фільм (12+).**
**10.05, 22.55** «1812. Супрацьстаянне». Дакументальны фільм (12+).
**11.00** «Кадры жыцця».
**11.50** «Веды ў кубе».
**13.10** «Легенды кіно» (12+).
**13.50 «Справа была ў Пянькове». Маст. фільм (12+).**
**15.15** «Працоўны фронт». Фільм адзінаццаты.
**15.40** Канцэрт Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра імя І. Жыновіча «Вінілавыя джунглі».
**16.40 «Артыстка з Грыбава». Маст. фільм (12+).**
**19.00** Выступленне кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь восьмага склікання. Графік размеркавання эфірнага часу размешчаны на сайце ЦВК rec.gov.by.
**19.50** «Асобы».
**20.00** «Новыя людзі».
**20.40** «Калыханка» (0+).
**23.55** «Жывая спадчына».

## Беларусь 5

**6.55** Слэм-данк.
**7.30** Хакей. Кубак Будучыні. Мінск. Беларусь (U-20) — Казахстан (U-20).
**9.25** Скрозь церні да зорак.
**9.55, 22.30** Самба. Міжнародны турнір на прызы Прэзідэнта Беларусі.
**15.00** Хакей. Кубак Будучыні.
**18.55, 21.50** «Спорт-цэнтр».
**19.05** «Авертайм: КХЛ».
**19.25** Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — ЦСКА (Масква). У перапынках — «Авертайм: КХЛ».
**22.00** Хакей для ўсіх.
**0.35** Гандбол. СЕХА-Ліга. «Віктор» (Стаўрапаль) — «Бусел Кітая» (Пекін).

## АНТ

**6.00, 7.15, 8.15** «Наша раніца».
**7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**7.10, 8.10** «Трывожная кнопка» (16+).
**9.10** «Аб'ектыўНа» (16+).
**10.10** «Жыць здарова!» (16+)
**11.15** «Усё зразумела з Марынай Караман» (16+).
**11.25, 21.15 Фільм «Замак з пяску» (16+).**
**12.35, 13.15, 23.35 Фільм «Доктар Ганна» (12+).**
**15.00** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**17.20, 18.20** Інфармацыйны канал (16+).
**19.00** «Маркаў. Нічога асабістага» (16+).
**20.00, 1.40** Час.
**22.25 Фільм «Вялікая. Залаты век» (12+).**

## СТБ

**6.00, 6.40, 7.45, 8.40** «СТБ раніца».
**6.30, 7.30, 8.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**9.00** Дак. праект. Без падману (16+).
**10.40 «Тыя, хто выжыў». Серыял (16+).**
**11.40** Дак. праект. Хронікі маскоўскага жыцця (16+).
**13.50 «Зграя». Серыял (16+).**
**14.50 «Зарэзерваваны спецназ». Серыял (16+).**
**16.50 «Воўк». Серыял (16+).**
**17.45 «Рыкашэт». Серыял (16+).**
**18.40** Спецрэпартаж СТБ.
**19.00** Прадстаўленне кандыдатаў у дэпутаты.
**20.15, 23.05** «СТБ-Спорт».
**20.20** «Капітальныя дэталі».
**20.30** «Міншчына».
**20.40** «Беларуская супержанчына».
**20.50 «Неўскі. Цень Архітэктара». Серыял (16+).**
**23.20** «Азаронак. Напрамую».
**0.55** Дак. праект. Дзевяностыя (16+).

## МІР

**5.00, 4.05 Тэлесерыял «Школа выжывання ад адзінокай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу» (12+).**
**6.00, 10.00, 13.00, 16.00, 18.30** Навіны.
**6.15** Спецыяльны рэпартаж (12+).
**6.25, 10.10, 17.15** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**8.05, 11.05, 14.10** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**9.00, 12.00, 15.05** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**13.15** «Міравое пагадненне» (16+).
**16.15** «Справы судовыя. Яблык разладу» (16+).
**18.40** Спецпраект «Усё для людзей»: адукацыя (12+).
**19.15** «Гульня ў кіно» (16+).
**22.55 Маст. фільм «Артыстка з Грыбава» (16+).**
**1.50** «Наша кіно. Неўвядальныя» (16+).
**2.40 Маст. фільм «Дзяўчына з характарам» (16+).**

## РТР—Беларусь

**6.00, 9.00, 11.30, 14.30, 17.30, 21.00, 23.00** Беларусь. Навіны.
**6.05, 9.05** «Новая раніца».
**10.05 Тэлесерыял «Таямніцы следства» (12+).**
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Так! Але...»
**12.20** «Пра самае галоўнае» (12+).
**13.00** «Кропкі над і» (16+).
**14.40** «60 хвілін».
**17.40** «Пуцёўка.BY».
**17.55 Фільм «Майстар і Маргарыта» (16+).**
**18.55** «Малахаў» (16+).
**21.30, 23.15 Тэлесерыял «Скліфасоўскі» (12+).**
**23.50** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

## НТБ—Беларусь

**6.10** «Астрапрагноз».
**6.15, 7.10, 8.25, 13.20, 22.40, 23.30** Сёння. Галоўнае.
**6.20** «Здарова здаровым быць!» (6+)
**7.25** Гісторыі вyратавання (12+).
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.40, 21.20** «НЗ.by».
**8.55** Сфера інтарэсаў.
**9.15** «Зламаць стэрэатыпы» (12+).
**9.35, 10.35 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў» (16+).**
**13.30** Надзвычайнае здарэнне.
**13.55** «За гранню» (16+).
**14.55** «ДНК» (16+).
**16.40, 20.00** Галоўнае. Сёння. Беларусь.
**16.50 Серыял «Пёс» (16+).**
**20.15, 21.40 Серыял «Шэф. Мужчынская работа» (16+).**
**22.45, 23.45 Дэтэктыў «Спецбат» (16+).**

## 8 канал

**7.00, 21.15** «Надвор'е».
**7.05** Мультпарад.
**7.30** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**7.35 Камедыя «Дзеткі напракат» (12+).**
**9.00** Дак. экран.
**10.10 Баявік «Фарсаж-4» (12+).**
**12.00 Серыял «Яна напісала забойства» (12+).**
**12.45 Меладрама «Монтэ Карла» (0+).**
**14.30** «Вострасюжэтны баявік».
**16.05 Камедыя «Каралева Чхорын».**
**17.25, 19.15** «Надвор'е» + «Эрана».
**17.30 «Дэтэктыў. Крымінал».**
**19.20 «Пры загадкавых абставінах».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.00** «Асалам алейкум, Беларусь!»
**21.10** «Урокі Лазуркіна».
**21.20 Меладрама «Выйсці замуж» (16+).**
**23.10** «Начны серыял».



## Культура

**6.30** «Пешшу...»
**7.00** «Вайна Зіновія Гердта».
**7.15, 20.05** «Першы Універсітэт». Дак. фільм.
**7.55** «Почырк эпохі».
**8.25** «Жыццё і лёс».
**8.50** «На ўсё астатняе жыццё». Маст. фільм.
**10.00, 12.30, 17.00, 19.30, 0.00** Навіны культуры.
**10.15** «Назіральнік».
**11.10, 1.15** XX стагоддзе.
**12.10** Колер часу.
**12.45** Навіны. Падрабязна.
**13.00** «Абсалютны слых».
**13.40, 14.00, 14.20, 0.15, 0.35, 0.55** «Порус». Тэлесерыял.
**14.40** «Дзмітрый Мендзялееў. Запаветныя думкі». Дак. фільм.
**15.35, 23.15** «Заўтра не памрэ ніколі». Дак. серыял.
**16.20** «Вячаслаў Ціханаў. Імгненні славы». Дак. фільм.
**17.15** Пернікавы домік.
**17.45** Майстры фартэпіяннага мастацтва.
**18.30** «Забытае рамяство». Дак. серыял.
**18.45, 2.10** «Вежа». Дак. серыял.
**19.45** «Галоўная роля».
**20.45** 300 гадоў Расійскай акадэміі навук.

## Настальгія

**6.00** «Быў час» (16+).
**6.45, 8.50, 9.40, 11.35, 14.35, 15.40, 17.30, 18.35, 21.40, 23.30, 3.40, 5.30** Музычная настальгія (12+).
**7.00** Маст. фільм «Грандатэль» (16+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**11.00, 17.00, 23.00, 5.00** «Блеф-клуб» (18+).
**12.00** «Спяем, сябры!» (16+)
**13.05** Маст. фільм «Новы Арлеан» (16+).
**18.00** «Каралі эпізоду» (16+).
**18.50** Маст. фільм «Рэбека» (16+).
**0.00** «Сто пытанняў да дарослага» (16+).
**0.40** «Ад смешнага да вялікага» (16+).
**1.25** Маст. фільм «Уцёкі Тарзана» (16+).

## EuroSport 1

**3.30, 6.30, 11.00, 16.00, 23.00, 2.30** Біятлон. Чэмпіянат свету, Нове-Места. Мікст.
**5.00, 1.25** Снукер.
**8.00, 14.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету, Вілінген. Жанчыны.
**9.00, 15.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету, Вілінген. Мужчыны.
**10.30** Гольф.
**12.30, 20.00** Горныя лыжы. Кубак свету, Гарміш-Партэнкірхен. Жанчыны.
**17.30** Веласпорт. Тур ААЭ. Жанчыны.
**18.30, 19.15** Горныя лыжы. Кубак свету, Шамані. Мужчыны.
**21.30** Біятлон. Чэмпіянат свету, Нове-Места. Эстафета. Мікст.
**0.00, 0.15, 1.15** Алімпійскія гульні.

## Кінакамедыя

**1.05** «Шосты элемент» (16+).
**3.45** «З джунгляў у джунглі» (12+).
**5.40** «Хто твая бабуля, чувак?» (12+)
**7.30** «Таксі-3» (16+).
**9.05** «Таксі-4» (16+).
**10.45** «Асцярожна, Кенгуру!» (18+)
**12.25** «Скарбы джунгляў» (18+).
**14.00** «Аднакласнікі-2» (16+).
**15.50** «Вельмі дрэнная вучылка» (18+).
**17.30** «Пара з будучыні» (12+).
**19.30** «Сэрцаедкі» (16+).
**21.45** «Непаслушнік-2» (12+).
**23.50** «Вясельная вечарынка» (16+).

## ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**9.35, 16.20** «Містычныя гісторыі» (16+).
**11.15** «Паглядзім» (12+).
**11.45, 17.20** «Цудоўнае стагоддзе» (16+).
**13.25, 19.05** «Сляпая» (16+).
**14.50, 20.30, 3.30** «Варажбітка» (16+).
**22.00** «Доказы з мінулага» (16+).
**23.40** «Твой свет» (16+).
**0.35** «Дзённік экстрасэнса» (16+).
**1.30** «Паслязаўтра» (16+).
**4.15** «Глядзі сам» (16+).
**4.30** «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).

## ТБ1000

**6.45** Беласнежка: помста гномаў (12+).
**9.00** Прыгажуня і пачвара (12+).
**11.05** Эспен у каралеўстве троляў (6+).
**13.10** Эспен у пошуках Залатога замка (6+).
**15.05** Анжаліка і кароль (16+).
**17.15** Неўтаймоўная Анжаліка (16+).
**19.00** Каханне на кончыках пальцаў (18+).
**21.10** З любоўю, Розі (16+).
**23.05** Звычка жаніцца (16+).
**1.20** Спенсер (16+).
**3.05** Дзіяна: гісторыя кахання (12+).
**4.45** Прынцэса Манака (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**5.30** Пін-код (6+).
**6.35** Тры каты (6+).
**7.15** Смяшарыкі (6+).
**7.55** Зіма (16+).
**9.15** Ціхая застава (16+).
**10.55** Крым (16+).
**12.45** Адчайныя дольшчыкі (16+).
**14.25** Аванпост (16+).
**17.00, 17.45** След (16+).
**18.25** За гранню рэальнасці (16+).
**20.25** Праўдадыр (16+).
**22.05** Мечаносец (16+).
**0.05** Сямейны бюджэт (16+).
**01.55** Яна+Янка (16+).
**3.25** Сняданак у таты (16+).
**4.55** Як казакі нявест выручалі (6+).
**5.10** Як казакі мушкецёрам дапамагалі (6+).

## National Geographic

**6.00** Самыя лепшыя суперкары (12+).
**6.40, 7.30, 8.15** Міжнародны аэрапорт Дубай (12+).
**9.00, 9.45, 0.45, 1.30** Асушыць акіян (12+).
**10.30, 11.15, 17.20, 18.05, 18.50, 19.30, 20.15** Наркабароны: захоп (16+).
**12.00, 12.45, 21.00, 21.45, 22.30** Злавіць кантрабандыста (12+).
**13.30, 14.15, 15.00, 2.15, 3.05, 3.50, 4.35** Расследаванні авіякатастроф (12+).
**15.45, 16.35, 23.10, 0.00** Злавіць кантрабандыста: аэрапорт Кенэдзі (16+).
**5.20, 5.45** Навуковыя глупствы (12+).

## ЯСНАе

**6.05** «Смяротная сутычка».
**7.40** «Мужчынская работа 2».
**9.15** «Аперацыя «Гаргона».
**10.55** «Марскія д'яблы».
**12.35** «Баранцава мора».
**14.25** «Сляпы-2».
**16.00** «Запаведны спецназ».
**17.40** «Шэф. Новае жыццё».
**19.15** «Крэмень. Вызваленне».
**21.00** «У зоне доступу».
**21.30** «Неадкладнае рэагаванне».
**23.15** «Паміж жыццём і смерцю».
**0.45** «Ідзі і глядзі».
**3.05** «Хронас».
**3.20** «Полымя пад попелам».

## Звязда

**6.00** «Фаня Алер. Вайна без антракту». Дак. фільм (12+).
**7.00, 19.30, 23.00** «Навіны».
**7.20, 21.40** «Як гартавалася сталь». Маст. фільм (12+).
**8.25** «Дзяржаўная граніца. «Мірнае лета 21-га года». Маст. фільм (12+).
**10.40, 11.25, 18.00, 18.45** «Кедр пранізвае неба». Серыял (16+).
**12.10, 13.00, 19.50, 20.45** «Ваенная разведка. Паўночны фронт». Серыял (16+).
**13.55** «Дзяржаўная граніца. «Усходняя мяжа». Маст. фільм (12+).
**16.25, 17.10** «М.У.Р. 1945». Серыял (16+).
**19.45, 23.15** «Навіны ў форме».
**22.45** «Паміж мірам і вайной. Звязаныя вайной». Дак. фільм (12+).
**23.20** «Георгій Жукаў. Ад рэкорду да парада». Дак. фільм (12+).
**23.50** «Аперацыя «Суворам». Кошт вызвалення». Дак. фільм (12+).
**0.20** «Дзяржынскі супраць Пілсудскага». Дак. фільм (12+).
**1.15** «Крылы Саветаў. Агонь у адказ». Дак. фільм (12+).
**1.45** «Сяргей Вайцяхоўскі. Генерал без Радзімы». Дак. фільм (12+).
**2.40** «Леон з Эльзаса. Беларускі партызан». Дак. фільм (12+).
**3.10** «22 чэрвеня. Асуджаны свет». Дак. фільм (12+).
**3.40** «Горад, які паўстаў з попелу». Дак. фільм (12+).
**4.10** «1939 год. Уз'яднанне». Дак. фільм (12+).

*У праграме магчымыя змяненні.*
*Перадрукоўка праграмы забароненая.*
*[СЦ] – фільм трансліруецца са скрытымі субцітрамі.*




# ГОРКІЯ ВІШНІ, або З такімі сябрамі і ворагаў не трэба

...Мікола з Паўлам блізкімі знаёмцамі ніколі не былі, але і чужымі, здаецца, таксама: на адным заводзе працавалі, часам размаўлялі — адзін пра аднаго хоць нешта ды ведалі. Мікола, у прыватнасці, жыў у камунальнай кватэры, Павел — у асобным доме са сваім агародам і нават садам.

Дык вось. Надумала неяк жонка першага зварыць на зіму духмянага вішнёвага варэння, узяла Міколу пад руку — у нядзельку ўдваіх ідуць на рынак па вішні. І трэба ж — Павел насустрач! Павіталіся, сказалі, куды ідуць... Той адразу ж з пытаннем:

— Людзі, а навошта вам рынак? У мяне гэтых вішань сёлета — хоць вазамі вазі! Дразды не склююць... Пайшлі са мной — наабіраеце, колькі захочаце!

Мікола памкнуўся адмовіцца, бо чуў, што ў Паўла снегу зімой не выпрасіш, але... не паспеў, бо жонка ўжо загарэлася: згадзілася, пацягнула яго да Паўлавай сялібы.

Вішань там было шмат — старых, высокіх (метры па чатыры), але ж прыйшлі — значыць, трэба лезці... І Міколавай жонцы — хоць трохі зручней, бо па драбіне. А вось яму самому прыйшлося чапляцца па дрэве, асцерагацца, каб, не дай бог, не зламаць нейкі сук, не пакінуць ягад ды не парваць новыя порткі...

Намучыліся, карацей, абое, змарыліся, а толькі прыселі, каб даць адпачыць рукам і нагам, — гаспадар падыходзіць, пытае:

— Ну, як разлічвацца будзем?

— Ды па сумленні, — кажа Мікалай.

— Тады паслухайце: расклад такі, — пачынае даводзіць Павел. На рынку вядзерца вішань каштуе шэсць рублёў. Але ж ягады там усялякія. А ў мяне вы рвалі найлепшыя (?) — якія хацелі. То за два вядзерцы плаціце па сем і разыдземся.

Жонка Мікалая аж здрыганулася ад гэтых слоў! А вось сам Мікола, здаецца, не: падаў гаспадару пятнаццаць рублёў:

— Рэшты, — сказаў, — не трэба. Рубель — за арэнду драбіны.

...Усю дарогу дамоў жонка ледзь не плакала: казала, што не трэба было ісці да Паўла, шкадавала змарнаванага часу, заплачаных грошай, сваіх да крыві падрапаных рук, парванай сукенкі... Ёй не хацелася больш вішнёвага варэння — ні варыць, ні есці.

Але ж гэта яшчэ не канец гісторыі.

Пакуль абіралі вішні, высветлілі, што ў абедзвюх сем'ях былі сабакі адной і той жа пароды — толькі ў Паўла «дзяўчынка», а ў Міколы — «хлопчык».

— Дай на вязку свайго кабяля, — папрасіў неяк Павел. — З'явяцца шчанюкі, — аднаго табе аддам. Сам выбераш... Якога захочаш.

«З твайго двара не захачу ніякага», — так хацеў адмовіць Мікола, успомніўшы вішні. Аднак стрымаўся: уголас сказаў, што сабака трохі прыхварэў...

— Шкада, — уздыхнуў Павел. — Я думаў, што мы табой сумесны бізнес адкрыем, будзем шчанят прадаваць, сябрамі станем.

«Ты мне ўжо вішань прадаў», — успомніў Мікола. І зноў прамаўчаў.

А нехта ж, напэўна, згадзіўся? Бо не ведаў, што з некаторымі сябрамі і ворагаў не трэба.

**Васіль Кабачэўскі,**
*г. Орша.*

# ПРЫЙШОЎ НЯЗВАНЫ І ІДЗІ НЯГНАНЫ

Студзень, дзень, бадзёры марозік, пад нагамі рыпіць сняжок. Крочу да аўтакрамы. Па дарозе да мяне далучаецца сябар маленства і таксама вялікі аматар праўдзівых звяздоўскіх гісторый.

— Апошнім часам, — кажа, — пра паляўнічых ды рыбаловаў друкавалася шмат... Можна б і пра нашага Пятровіча... Помніш, як мы яму зайца ў двор загналі?

— А як жа! Вёска з тыдзень смяялася!

...Зіма ў той год была досыць халодная, але ж нас, хлапчукоў, гэта не палохала. Не мелі мы ні камп'ютараў, ні планшэтаў, ні «мабілак», а вось лыжы ды санкі былі ці не ў кожнага. «Гайда на іх да жвіроўні!» — прапанаваў нехта, і мы ўсім кагалам рванулі з месца.

Жвіроўня (вяскоўцы там бралі пясок) была зусім недалёка, побач з полем, з маладым калгасным садам. Для зайцаў — самае тое, бо ў садку ды на полі з азімымі (на адкрытых участках снег здзімала) — для іх добрая сталоўка, у самой жвіроўні — лежні... Заяц там сёмы сон, можа, бачыў, а тут мы — на лыжах.

Касы падхапіўся, падскочыў уверх і даўся ў бок чыгункі. Мы — ну як было ўтрымацца?! — кінуліся ўслед, нават, здаецца, дагналі: заяц, добра такі адбегшы, прысеў на заднія лапы і нібыта чакаў... Потым рэзка сарваўся з месца, даў цягу — уздоўж пасадак, цераз лог — а далей — знік у вясковых гародах!

І ўжо там, мусіць, аддыхвацца хацеў, як насустрач (мы пра гэта потым даведаліся) выскачыў дзядзька Пятровіч, наш паляўнічы. Ён, аказваецца, сеў абедаць, глянуў у акно і вачам не паверыў — заяц пад яблыняй, сярод белага дня...

Дзядзька стрэльбу з цвіка і ледзь не голы — на двор. Глянуў у адзін бок, у другі, збегаў у гарод, — касы як срозь зямлю праваліўся!

Такім чынам стрэльба ў той раз прамаўчала, а вёска — ды ні ў якім разе! Бо дзіва ж: заяц — сам — да паляўнічага на абед прыходзіў, а той нават пораху пашкадаваў.

«Прыйшоў нязваны — ідзі нягнаны», — здаецца, так нашы продкі казалі пра гасцей?

**І. Букоўскі,**
*в. Шуневічы, Глыбоцкі раён.*



Малюнак Анатоля ГАРМАЗЫ.

# ГРЭХ У МЕХ (Споведзь лавеласа)

*— Не святы я —*
*вінаваты:*
*Прыпаўзаў дамоў паддаты,*
*Па чужых кутах бадзяўся,*
*Вось аднойчы і папаўся.*
*Гэта ж лёг —*
*бяды не чую,*
*З жонкай сплю,*
*А сн-ю-ю —*
*дру-гу-ю.*
*Лашчу мілку сваю ў сне*
*Мармычу імя яе...*
*Жонцы*
*мову адняло:*
*Побач*
*зноў (?!)*
*такое зло!..*
*Помсту выдумала,*
*выдра —*
*Ціхай сапай,*
*тонка, хітра:*
*Сню —*
*каханка абдымае,*
*Явай — жонка...*
*спавівае:*
*У прасціну ўкруціла,*
*Скотчам густа абляпіла.*
*Пабудзіла рана-рань,*
*Кажа:*
*«Ну, мілок, паглянь:*
*Добра я нагрэла прас...*
*Здраджваў ты*
*апошні раз:*
*Шашні строіць*
*больш не будзеш,*
*Нават думкі*
*ўсе забудзеш!»*
*Мне ж і праўда —*
*не да гуляў,*
*Я — нібыта —*
*у той кашулі,*
*Што ў дурдоме надзяюць:*
*Цяжка...*
*Нават уздыхнуць...*
*Як жа я тады ўзмаліўся,*
*На калені станавіўся:*
*— Жонка, любая, прабач!*
*Зажыву цяпер інакш:*
*Ні на яве, ні ў сне*
*Больш не здраджу я табе!*
*Слёзы лью,*
*клянуся Веры*
*Ды...*
*не верыць ні халеры!*
*Бо ў каторы ж раз*
*«малюся»*
*А пасля...*
*Вазьму й сарвуся:*
*Распачну «любоў»*
*спачатку...*
*Жонка —*
*прасам —*
*ляп пячатку —*
*На залысіне — кляймо,*
*Каб здалёк відаць было,*
*Каб урэшце помніў я,*
*Што ёсць жонка і сям'я.*
*...З меткай выгляд*
*маю кепскі,*
*Як Ільіч —*
*заўжды я ў кепцы,*
*Дома вечарам-уночы*
*Да залётак не ахвочы —*
*Рукі, ногі нібы ў путах...*
*За грахі мае пакуты.*
*Лавеласам жа — наказ:*
*Як налева сцягне вас,*
*Калі гулі — ваша шчасце,*
*Каб у пастку не папасці,*
*Не пытайце ў любак згоды,*
*А завіце іх заўсёды*
*Рыбкай, зайкай,*
*Кіскай, ласкай*
*Ці яшчэ якою трасцай!*
*Мо прыгода і ўдасца.*
*Кара жончына міне*
*І не будзе так, як мне!*

**Любоў Чыгрынава,**
*г. Мінск.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

***АД ЯЕ Ж напамін:*** *усе «вясёлыя і праўдзівыя гісторыі» на старонках «Звязды» не проста друкуюцца — яны ўдзельнічаюць у конкурсе на найлепшую.*

*Для таго каб вызначыць іх, працуюць два журы — малое рэдакцыйнае і вялікае чытацкае, у склад якога можа ўвайсці кожны ахвотны, той, хто цягам года будзе чытаць усе змешчаныя гісторыі (бібліятэкі ці сайт «Звязды» ў дапамогу!), ды нейкім чынам пазначаць, выразаць, адкладваць, запісваць тое, што спадабалася.*

*Каб бліжэй да Каляд перачытаць, магчыма, яшчэ раз, выбраць дзясятку найлепшых і пералік дасласць у рэдакцыю. Творы, якія набяруць максімальную колькасць галасоў, выйдуць у лідары — з усімі адсюль наступствамі...*

*Так што чытайце, пішыце (калі ласка, з нумарам тэлефона для аператыўнай зваротнай сувязі). І, вядома ж, выпісвайце — сваю, найстарэйшую, «родную газету на роднай мове»!*

Неасабісты суб'ектыў



# Пра герояў і наадварот

## Чаму хтосьці праходзіць міма, а хтосьці спыняецца

ТРАЛЕЙБУС ужо адыходзіў ад прыпынку і раптам рэзка — аж паваліліся адзін на аднаго пасажыры і адарваліся «рогі» — затармазіў. Двэры абурана зашумелі, і толькі тыя, што стаялі на задняй пляцоўцы і ўсё бачылі, залямантавалі: «Чалавек пад коламі!» Дзверы адчыніліся, усе кінуліся глядзець, што там нарабілася. На бардзюры, які аддзяляе праезную частку ад тратуара, каля задняга кола тралейбуса ляжаў мужчына. Пад колы ён не трапіў, проста паслізнуўся, даганяючы тралейбус, і ўдарыўся галавой аб бардзюр. Паслізнуўся, па ўсім відаць, не проста так: пах спіртнога ад яго быў чуваць за некалькі метраў. Але ляжаў ён зусім як нежывы — выпрастаўшыся, як струна, на тым бардзюры, з акрываўленым тварам. Усе — а людзей на тым прыпынку было нямала — прыгаломшана сталі, перашэптваліся, хтосьці набіраў нумар «хуткай». Але ні адзін з прысутных не падышоў, не дакрануўся, не паспрабаваў дапамагчы.

Была ў тым цікаўным натоўпе і ваша пакорная слуга. Адчувала сябе надзвычай паскудна, але, ну хоць забіце мяне, не магла сябе прымусіць наблізіцца да няшчаснага, каб хоць памацаць пульс на шыі. А раптам ён сапраўды мёртвы — ад адной гэтай думкі станавілася вусцішна. А яшчэ гэта мярзотнае, дробязнае: а чаму я павінна? вунь колькі людзей вакол...

ГЭТА жанчына на прыпынку не стаяла. Яна проста праходзіла міма. Зацікаўлена глянула, з чаго такі тлум, і тут жа кінулася да чалавека, што ляжаў на бардзюры. Нагнулася над ім, не баючыся запэцкаць доўгае светлае паліто. «Жывы, — выгукнула. — Чаго пасталі? Мужчыны, перанясіце яго на лаўку!» Усе, бы адышоўшы ад здранцвення, кінуліся дапамагаць. Пацярпелага пасадзілі на прыпынку, хтосьці з жанчын стаў выціраць яму твар вільготным сурвэткай, іншая кабета дастала з сумкі валідол. Ён расплюшчыў вочы, няўцямна паглядзеў вакол, страсянуў галавой, памкнуўся ісці. Некалькі клапатлівых рук утрымалі яго — ужо ніхто не баяўся дакранацца да п'янага, але — жывога. Пад'ехала «хуткая», і нават зусім натуральна было, што тая жанчына ў светлым паліто села разам з ім у машыну, тлумачы ці то нам, разявакам, ці то самой сабе: «Трэба ж сваякам ягоным пазваніць...» «Пэўна, сама доктар», — вымавіў хтосьці з натоўпу, які ўжо пачаў радзець. Усе згодна з палёгкай уздыхнулі і разышліся па сваіх справах...

Тая жанчына падалася мне надзіва знаёмай. Праз некалькі хвілін дайшло: я бачу яе ледзь не кожны дзень, проста яна без верхняй вопраткі і ва ўніформе. Яна працуе ў невялікай краме праз дарогу. Заўжды ветлівая, усмешлівая, купляючы ў яе прысмакі, нярэдка перакідваюся з ёй парай слоў. Выходзіць, яна ніякі не ўрач. Звычайная прадаўшчыца. Чаму ж тады?.. Навошта ёй усё гэта?

А яна проста не можа інакш. Гэтаму не вучаць ні ў адной школе, ні ў адным універсітэце, і прафесія тут абсалютна ні пры чым. Як не мог інакш той брэсцкі таксіст, пра якога сёння напісалі ў многіх навінах. Яго заказчык папрасіў пад'ехаць на пэўны адрас, забраць пакунак і прывезці ў іншы раён горада. Таксісты не кур'еры, але падобныя заказы практыкуюцца, так што для яго гэта была звычайная работа. Але, прыехаўшы па перадачу, ён убачыў старую разгубленую жанчыну, якая аддала яму той пакунак. Да заказчыка ён яго не давёз: проста ў пэўны момант развярнуўся з паўдарогі і аддаў бабулі перадачу назад. Аказалася, у пакунку былі грошы — амаль дзве тысячы долараў, якія ў жанчыны выманілі махляры, каб нібыта выратаваць яе дачку ад адказнасці за ўчыненае ДТЗ. (Схема ўжо заезджаная, але, як ні дзіўна, людзі ўсё яшчэ на яе вядуцца.) Навошта тое было таму таксісту — вось у чым пытанне. Ехаў бы сабе і ехаў, перадаў бы той пакунак, атрымаў грошы за заказ. Што яму да той невядомай бабулі, да яе праблем?

Ён проста, як і тая прадаўшчыца, НЕАБЫЯКАВЫ. Якасць, прысутная яшчэ некалькі дзесяцігоддзяў таму ці не кожнаму чалавеку, сёння, асабліва ў вялікіх гарадах, становіцца даволі рэдкай з'явай. Не, усе мы самі па сабе вельмі нават неблагія людзі, многія нават добрыя, чулыя, душэўныя. Са сваёй сям'ёй, са сваімі калегамі, са сваімі сябрамі і блізкімі. Але адгукацца на праблемы нейкіх зусім незнаёмых людзей... Дык іх, незнаёмых, вакол вунь колькі! На ўсіх не разарвешся. Да таго ж хай іншыя рэагуюць, чаму менавіта я? Іх таксама вакол шмат, хтосьці ды спыніцца, зверне ўвагу. Канешне, у кожным з нас яшчэ сядзіць наш вясковы продак, які нізавошта не прайшоў бы міма. Бо ўявіць апісаную ў пачатку сцэну ў вёсцы проста немагчыма, так проста не можа быць. Там і сёння нават самага лядашчага п'яніцу, які ўпаў па дарозе дадому, хтосьці абавязкова або клапатліва пакладзе на лаўку, або даставіць па месцы прызначэння... Дык вось гэтае вясковае «я» і цвеліць сумленне, і ад таго адчуваеш сам сябе надзвычай паскудна, бо не спыняешся, не падыходзіш, не рэагуеш. Але ж ганарлівы гараджанін бярэ верх — і ты не спыняешся, не падыходзіш, не рэагуеш... Ты ж не герой ніякі, звычайны чалавек — што з цябе ўзяць?

ПАМЯТАЕЦЕ гісторыю, пра якую некалькі гадоў таму пісалі і расказвалі многія, — пра дзядулю дзесьці ў Заводскім раёне Мінска, які ледзь не памёр на людной вуліцы. Дзядуля выйшаў у краму, на галалёдзе яго кіёк паехаў убок, стары паваліўся, а кіёк адскочыў — самому не дастаць. Без яго небарака падняцца не мог, таму пачаў прасіць дапамогі ў мінакоў, якіх у той час на вуліцы было нямала. Вы думаеце, хто-небудзь з іх дапамог? Усе толькі прыспешвалі хаду. І невядома, чым бы скончылася тая гісторыя, калі б не міліцэйскі патруль, які праязджаў міма. Хлопцы спынілі машыну, паднялі старога, выклікалі «хуткую», пазванілі сваякам. Дзякуй богу, усё абышлося.

ТАК хочацца верыць, што тымі маладымі міліцыянерамі кіраваў не толькі службовы абавязак, а яшчэ штосьці, не менш важнае. Тое, што ўласцівае ўсім нам, але мы яго надзейна хаваем. Так надзейна, што самі і забываемся, што яно ў нас ёсць.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ
### по продаже движимого имущества

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов **№ 2024.Ч.002.00016** по продаже имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by

**Продавец:** открытое акционерное общество «Лепельский ремонтно-механический завод», 211099, Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Борисовский тракт, 102, тел. 8 (02132) 3-61-86.

**Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения торгов: 05.03.2024 в 09.00** (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1.** Экскаватор ЭО-2621В, рег. знак ВК-2 9570, 1989 г. в., заводской № 159392, марка (модель) шасси ЮМЗ-6КЛ, инв. № по бухг. учету 2258 по адресу: Витебская обл., г. Лепель, ул. Борисовский тракт, д. 102.

**Нач. цена:** 14 640,00 бел. руб. с учетом НДС 20 %.

**Задаток:** 1464,00 бел. руб.

Электронные торги проводятся в соответствии с Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» «etpvit.by».

**Для участия в электронных торгах** необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу: https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП.

**Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 04.03.2024.**

**Сумма задатка перечисляется оператору электронных торгов на р/с:** № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

**Условия электронных торгов:** Победитель эл. торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 10 (десяти) рабочих дней с даты проведения электронных торгов и утверждения протокола электронных торгов возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов и оплатить услуги Оператора ЭТП согласно прейскуранту, размещенному на сайте ЭТП; заключить договор купли-продажи предмета электронных торгов в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения электронных торгов и утверждения протокола электронных торгов; оплатить предмет эл. торгов в порядке и сроки, предусмотренные договором купли-продажи. По соглашению сторон возможно предоставление рассрочки оплаты предмета электронных торгов.

С подробной информацией о предмете электронных торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by, в разделе: транспорт. Организатор электронных торгов имеет право отказаться от проведения электронных торгов в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до наступления даты их проведения. Ознакомиться с предметом электронных торгов можно в рабочие дни с 09.00 до 16.00 по предварительному согласованию с Продавцом по тел. +375 (29) 8720308.

---

**Считать недействительными** утерянные ЗАО «СК «Белросстрах» бланки страховых полисов: «Добровольное от НС» ф. 2РН, 2РП серии НС № 0052808 – 1 шт.

УНП 100782388

---

**Считать недействительным** редакционное удостоверение № 28 от 21.08.2020 года специального корреспондента редакции газеты «Звязда» СИДОРОК Ирины Николаевны **в связи с его утерей.**

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ
### по продаже не завершенного строительством жилого дома и земельного участка в частную собственность в г. Гродно 27 февраля 2024 года

| № лота | Местонахождение земельного участка, его кадастровый номер | Площадь земельного участка (га) | Характеристика (описание) не завершенного строительством капитального строения | Ориентировочные расходы по подготовке документации для проведения аукциона, руб. | Начальная цена предмета аукциона (в том числе: начальная цена не завершенного строительством капитального строения; земельного участка), руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **Гродненская область, г. Гродно, ул. Гожская, 82 (У-1418, микрорайон «Зарица-4»), 440100000003004256** | 0,1108 | Незавершенное незаконсервированное капитальное строение. Наружная площадь 91 кв. м; степень готовности 12 %. Фундамент: фундаментные блоки бетонные сплошные | 241,44 | 28 645,81 (6 330,69; 22 315,12) | 5 700 |

Земельный участок предоставляется в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Инженерные коммуникации на участке отсутствуют. Возможность подключения к внеплощадочным сетям водоснабжения, газоснабжения, электроснабжения и пр., и точки подключения определяются проектом.

Земельный участок может иметь ограничения и обременения. Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона: внесение платы за предмет аукциона; возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; продолжить строительство жилого дома в установленный срок.

**Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», телефоны: +375 (152) 626055, 626056.**

